

ШТО ВЫЯЎЛЯЕ СКРЫНІНГ?

7

ГАННА ЛЮБЯНКОВА ПРА ЖЫЦЦЁ ПА-ЗА ТЭЛЕЭКРАНАМ

9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ЛЮТАГА 2021 г. СЕРАДА № 20 (29389)

## ЛІЧБА ДНЯ

**1 млрд кВт·гадз.**

*выпрацаваў энергаблок № 1 Беларускай атамнай станцыі з моманту ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму. У цяперашні час на першым блоку працягваецца этап вопытна-вытворчай эксплуатацыі, праводзіцца тэсціраванне сістэм і абсталявання на намінальным узроўні магутнасці. З уводам двух энергаблокаў БелАЭС у прамысловую эксплуатацыю выпрацоўка электраэнергіі складзе каля 18 млрд кВт·гадз. у год. Станцыя забяспечыць каля 40 % унутраных патрэб у электраэнергіі і дасць магчымасць штогод замяшчаць каля 4,5 млрд куб. м прыроднага газу.*



# Лёгкая пара беларускай Поўначы



Больш за дзесяць гадоў сталічная жыхарка Святлана ГЕРАСІМЧЫК жыве ў вёсцы Чарнавокі Верхнядзвінскага раёна — невялікай і малалюднай, але лясной і ў краі азёр. Захапленне пенсіянеркі — рыбалка, у тым ліку і зімовая. А яшчэ і лазенька з парылкай. Асабліва пасля марознага дня, праведзенага на возеры, Святлана Васілеўна любіць прапаліць сваю лазню і ўволю пасядзець з бярозавым венічкам на гарачай паліцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Генеральным дырэктарам авіякампаніі «Белавія» прызначаны Ігар Чаргінец. Ён змяніў на гэтай пасадзе Анатоля Гусарава.

• **Люты ў Беларусі сёлета чакаецца халаднейшы, чым звычайна.**

• Крамам дазволілі інтэрнэт-гандаль беларускімі ювелірнымі вырабамі.

• **У Столінскай райбальніцы пачаў працаваць кабінет камп'ютарнай тамаграфіі.**

• Вытворчасць прадуктаў харчавання ў Беларусі ў 2020 годзе вырасла на 2,9 %.

• **У Беларусі захавалася больш як 860 тысяч га балот у натуральным стане.**

• Ігрок ХК «Дынама-Мінск» Шэйн Прынс прызнаны найлепшым форвардам студзеня ў КХЛ.

ISSN 1990 — 763X

Перспектыва

# Гомельшчына: пункты росту і каштоўныя рэзервы



**За эканамічнымі паказчыкамі — якасць жыцця людзей, развіццё горада і вёскі, работа сістэм аховы здароўя, адукацыі, культуры і, што не менш важна, удасканаленне механізма кіравання. Намеснік старшыні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Андрэй КАНЮШКА аб дасягненнях і перспектывах рэгіянальнага развіцця.**

### ЗАРОБКІ ВЫРАСЛІ НА ЧВЭРЦЬ

Жыхары Гомельскай вобласці — гэта 15 працэнтаў насельніцтва Беларусі. Сёння ў рэгіёне пражывае каля 1 мільёна 388 тысяч чалавек, 60 % жыхароў вобласці — грамадзяне працаздольнага ўзросту. Гомельшчына — гэта таксама адзін з найбуйнейшых рэгіёнаў, які дынамічна развіваецца і фарміруе больш за 10 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту нашай краіны (трэцяе месца пасля Мінска і Мінскай вобласці).

СТАР. 5

Трыялогія

# Беларуская кніга мусіць быць для нас прыярытэтам

## Дыскусія на фоне сусветнага крызісу кніжнага гандлю

**«Кнігі — сябры. // Іх кідаюць перш за ўсё: // Яны цяжкія, // Як дзесяць вазоў з цэглай...» — калісьці пачынаў Уладзімір Караткевіч сваё паэтычнае разважанне пра кнігі... Сцвярджаючы: каб выратаваць не толькі цела, але і душу, чалавек пры першай магчымасці трацію апошняе, каб абнавіць дамашнюю бібліятэку...**

Калі пачалася сусветная пандэмія, эпоха ізаляцыі і каранціну, многія пачалі казаць: ну вось, цяпер, перастаўшы наведваць клубы, гандлёвыя цэнтры і «завісаць» у кавярнях, людзі павінны вярнуцца да кнігі! Яна ж найлепшы суразмоўца і ратунак ад суму! А скептыкі паўтаралі тое ж, з чаго пачынаецца верш Караткевіча: чалавецтву не да кніг і папаўнення дамашніх бібліятэк.

А як адбываецца насамрэч? Пра гэта мы разважаем з **намеснікам генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай і выдавецкай справе Алесем СУШАМ і дырэктарам крамы «Акадэмічная кніга» Вольгай ГЛУХОЎСКАЙ.**

СТАР. 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба эфектыўна выкарыстоўваць фармат форуму для вырашэння найбольш актуальных пытанняў»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення VI Усебеларускага народнага сходу

**У нарадзе ўзялі ўдзел спікеры абедзвюх палат беларускага парламента, кіраўнікі Адміністрацыі і спраў Прэзідэнта, Мінскага гарвыканкама і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.**

### УЗРОВЕНЬ — ВЫСОКІ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цікавасць да форуму, які адбудзецца 11—12 лютага, як ніколі вялікая, што накладвае на ўлады асаблівую адказнасць.

«***Гэта найважнейшая падзея ў жыцці краіны, і мы абавязаныя правесці яе на самым высокім узроўні,*** пра што ўжо казалі неаднойчы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка спытаў ва ўдзельнікаў нарады, ці ўсё гатова для сустрэчы дэлегатаў. «У сталіцу прыедуць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў. Больш за тое, гэта прадстаўнікі ўсіх груп, як прынята казаць, нашай грамадзянскай супольнасці: грамадскіх арганізацый, палітычных партый, працоўных калектываў, асобных рэгіёнаў. Таксама будуць запрошаны і госці, — сказаў Прэзідэнт. — Таму гэтыя бытавыя і іншыя рэчы — вельмі важныя для тых, хто будзе працаваць на сходзе. Тут людзі, якія прыбылі з рэгіёнаў, павінны адчуваць сябе як дома. І яны — дома. Не «як дома», а яны дома. Яны прыехалі да сябе дадому — у сталіцу нашай Радзімы».

Таму неабходна гарантаваць бяспеку, камфортныя ўмовы працы і адпачынку ўдзельнікам сходу, дадаў беларускі лідар. Ён даручыў адпаведным службам узяць на пастаянны кантроль гэтыя пытанні.

### РАШЭННІ — УЗВАЖАНЫЯ

«***Нам трэба эфектыўна выкарыстоўваць фармат форуму для вырашэння найбольш актуальных пытанняў.*** Тут збяруцца людзі розных узростаў, прафесій, як я ўжо сказаў, і сацыяльных статусаў, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — За імі тысячы, тысячы і мільёны беларускіх людзей, працоўных калектываў. Гэтых людзей выбраў народ. Мы павінны пачуць голас кожнага, увесь спектр меркаванняў, якія ёсць сёння ў краіны, па самых розных пытаннях нашага жыцця».

Напярэдадні сходу трэба яшчэ раз больш дэталёва прапрацаваць праблемы, якія хвалююць людзей, звярнуў увагу Прэзідэнт.

Ён выказаў задаволенасць тым, як у абласцях прайшло абмеркаванне асноўных кірункаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і шэрагу іншых пытанняў, якія людзі агучылі на дыялогавых пляцоўках.

«Павінен сказаць, што добра на месцы арганізавалі гэтыя пытанні памочнікі Прэзідэнта, упаўнаважаныя па абласцях і асабліва губернатары, — сказаў ён. — Усё было сабрана, скажам, у Гродзенскай або Магілёўскай, іншых абласцях, вынесена на ўзровень вобласці, сабраліся дэлегаты — будучыя ўдзельнікі Усебеларускага народнага сходу — і абмеркавалі гэтыя пытанні».

Гэта дазволіла, па словах беларускага лідара, сканцэнтраваць і вынесці на УНС пытанні ад рэгіёнаў.

«***Гэта непасрэдна дазваляе адчуць пульс жыцця на месцах, глыбей пагрузіцца ў сутнасць праблем і такім чынам забяспечыць максімальную ўзважанасць і абгрунтаванасць будучых рашэнняў,*** — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Як правіла, па выніках УНС прымаецца рэзалюцыя, якая мае агульны, канцэптуальны характар, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «***Там не будзе дробязяў,*** дробязі — у Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, яна будзе апублікаваная, яна больш канкрэтная, — сказаў ён. — ***Рэзалюцыя абазначыць асноўныя напрамкі руху нашай Беларусі да пэўных мэт***».

Людзей цікавяць розныя пытанні, дадаў беларускі лідар. У аснове асноў — эканоміка і надзённыя пытанні (цэнаўтварэнне, тарыфы на ЖКП, рабочыя месцы, заробкі і гэтак далей).

«Паступае шмат прапаноў і ў галіне грамадска-палітычнага развіцця. ***Нашы грамадзяне сёння неабыякавыя да лёсу краіны, яны асабліва востра адчуваюць цяперашні адказны перыяд, калі ўсе мы павінны быць разам, павінны быць адзіныя, каб захаваць незалежную беларускую дзяржаву,*** — дадаў Прэзідэнт. — Яшчэ адно, што вельмі хвалюе людзей, — як адаб'юцца прынятыя намі рашэнні на штодзённым жыцці кожнага канкрэтнага чалавека?»

Праз канцэптуальныя пытанні рэзалюцыі чалавек павінен убачыць канкрэтна сябе, абазначыў задачу кіраўнік дзяржавы, канкрэтныя пытанні, якія яго будуць хваляваць.

«Скажам, калі мы будзем звяртацца да пытання продажу дзяржмаёмасці і прыватызацыі прадпрыемстваў, павінен быць канкрэтны адказ на гэтае пытанне, — растлумачыў беларускі лідар. — Каб людзі, якія працуюць на «Беларуськаліі», «Гомсельмашы», МТЗ, МАЗе, БелАЗе, разумелі: або іх заўтра будуць прадаваць з малатка, або яны будуць працаваць на гэтых дзяржаўных прадпрыемствах і мець гарантыю кантролю дзяржавы і гарантыю таго, што іх дзеці змогуць там працаваць».

Людзі павінны разумець, да чаго рашэнні УНС прывядуць ужо сёння, што будзе заўтра і паслязаўтра, запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта галоўнае, пра што мы перш за ўсё павінны думаць, калі прымаем тыя ці іншыя рашэнні», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта нарада — перадапошняя публічная сустрэча перад сходам. Будзе яшчэ адна (калі не лічыць асобных размоў лідара з кожным членам аргкамітэта), дзе будуць разгледжаны ўсе дробязі — ад залы, дзе пройдзе сход, да дакументаў, якія да яго адносяцца.

### «АБ'ЯВІЛІ БАЙКОТ — БАЙКАТУЙЦЕ»

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў рэакцыю апанентаў улады на правядзенне VI Усебеларускага народнага сходу.

«Тут некаторыя, перш за ўсё беглыя і іншыя так званыя апазіцыянеры, плачуць і рыдаюць, што яны не трапілі, — сказаў ён. — Калі не трапяць на Усебеларускі народны сход, значыць — «нелегітымны». Але, па-першае, я сказаў, што мы выбіралі людзей, якія жывуць у нашай краіне. А беглых будуць выбіраць у Польшчы, Літве, някага, відаць, ва Украіне, нехта, магчыма, у Расіі, хоць няшмат». З замежжа на VI Усебеларускі сход запрашаюць толькі гасцей, звярнуў увагу беларускі лідар.

«Па-другое. Яны аб'явілі байкот Усебеларускаму народнаму сходу. Гэта значыць, калі вы яго байкатуеце, чаго вы рыдаеце? Вы аб'явілі байкот — байкатуйце, — дадаў ён. — Больш за тое, праз некаторы час пасля аб'яўлення байкоту яны вырашылі правесці форум замежжа. Ну праводзьце — ніхто ж не перашкаджае. Збірайцеся ў Польшчы, Літве і праводзьце».

### «МЭТА — ЗРАБІЦЬ КРАІНУ ЛЕПШАЙ»

З 29 снежня да 6 студзеня ў рэгіёнах Беларусі былі абраны ўдзельнікі VI Усебеларускага народнага сходу, далажыў Прэзідэнту старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні форуму прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка.

Абрана 2226 дэлегатаў, з якіх 1175 (49 %) — прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў і 1051 чалавек (44 %) — прадстаўнікі найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў краіны.

«З улікам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі агульная колькасць удзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу склала 2394 чалавекі», — падсумаваў прэм'ер.

«Адрозненне ад папярэдніх сходаў у тым, што тут фактычна не проста сход, гэта ўжо элемент, які ўвенчвае ўвесь комплексны працэс, што пачаўся з дыялогавых пляцовак, — паясніў пасля нарады журналістам Раман Галоўчанка. — Па сутнасці, была акумуляваная ўся канструктыўная думка народа, здаровая ініцыятыва, накіраваная на стварэнне, акумуляваная падчас працяглага перыяду і на дыялогавых пляцоўках, і ў грамадскіх прыёмных, і ў тэлефанаваннях, і ў паведамленнях, якія паступаюць у парламент, на сайт сходу. Такім чынам, фактычна выкрышталізавалася тая маса пытанняў і прапаноў па развіцці краіны, што рэальна хвалююць розныя сацыяльныя групы».

Абмеркаванні праходзілі, па словах кіраўніка ўрада, не «для галачкі», а вельмі прадметна. Іх вынікі будуць улічаныя ў пяцігадовай праграме развіцця краіны і, магчыма, лягуць у аснову выніковых дакументаў сходу.

«Гучалі вельмі розныя ацэнкі, прапановы і меркаванні, дастаткова дыверсіфікаваныя, але што важна — людзі, якія ўдзельнічалі ў гэтым працэсе, сапраўды былі тыя, хто гэтага хацеў, і тыя, каго сапраўды клапоціць будучыня нашай Радзімы, якія перажываюць, бачаць кірункі мадэрнізацыі, развіцця краіны. Галоўнае тое, што яны ўсе зараджаныя на пазітыў, — рэзюмаваў Раман Галоўчанка. — У людзей розныя пункты гледжання, але канчатковая мэта адна — зрабіць нашу краіну лепшай».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

Сацыяльныя перспектывы

# КВАЛІФІКАВАНАЯ ПРАЦА І СЯМЕЙНАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

**Шчаслівая сям'я, эфектыўная занятасць, прыстойныя даходы, сямейнае прадпрымальніцтва і актыўнае даўгалецце. Як беларусам атрымаць усё гэта, разважалі ўчора ў Навукова-даследчым інстытуце працы ў межах грамадскага абмеркавання праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады.**

### Шчаслівая сям'я — шматдзетная

Эксперты закранулі пытанні ўмацавання дэмаграфічнага патэнцыялу, развіцця сямейнай палітыкі, садзейнічання эфектыўнай занятасці і ўстойліваму росту дабрабыту, паляпшэння сацыяльнага абслугоўвання.

— Усе меркаванні экспертаў будуць накіраваны распрацоўшчыкам праекта праграмы, каб узмацніць навуковую абгрунтаванасць палажэнняў гэтага дакумента і падтрымаць пазітыўныя пасылы, якія ён утрымлівае, — паабяцала **Наталля МІРОНАВА, дырэктар Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Сярод мяркуемых кірункаў праекта — падтрымка нараджальнасці, стымуляцыя да росту прадукцыйнасці працы ў рэальным сектары, меры па пашырэнні даступнасці сацыяльных паслуг і павышэнні якасці сацабслугоўвання з укараненнем шэрагу інавацыйных формаў абслугоўвання, каб людзі маглі атрымаць дапамогу больш якасную і ў большым памеры.

У праграме падкрэсліваецца, што шчаслівая сям'я — шматдзетная. І дакумент скіраваны на тое, каб падтрымліваць каштоўнасці беларускага грамадства, якія склаліся за гады яго існавання. Гэта і свядомае бацькоўства, і магчымасць мець больш часу даглядаць малых жанчынам, якія сумяшчаюць работу і выхаванне дзяцей.

Плануецца таксама падтрымаць сямейнае прадпрымальніцтва — гэта кірунак праграмы, які скіраваны на забяспечанасць сем'яў работай (магчымасць развіваць свой сямейны бізнес), нават у тых рэгіёнах, дзе ёсць праблемы з работай на буйных прадпрыемствах, дадала яна.

### Перавучваць моладзь, беспрацоўных і працуючых

Абмеркаванне палажэнняў праграмы з экспертамі вельмі важнае, бо за стратэгічнымі кірункамі можна ўпусціць нейкія дэталі, якія здольныя падказаць толькі знаўцы, падкрэсліў **Валерый ГАЛУБОЎСКІ, рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі:**

— Каб змены адбыліся, неабходна звярнуць увагу на кваліфікацыю персаналу. Прычым не толькі інжынерна-тэхнічнага або кіраўнікоў з вышэйшай адукацыяй, але і тых, хто рэальна будзе ўкараняць гэтыя навацыі. Тут і энергаэфектыўнае будаўніцтва, індустрыя 4.0 у прамысловым сектары, электрамабілі і іншае. Праектам праграмы закладзены пакзчык павелічэння на 30 % прадукцыйнасці працы, а прадукцыйнасць гэта якраз кваліфікацыя, здольнасць у больш кароткія тэрміны якасна выконваць работу.

На думку дырэктара ўстановы, дасягнуць запланаваных паказчыкаў можна, калі больш увагі аддаць механізмам перанавучання і павышэння кваліфікацыі людзей, якія працуюць на прадпрыемствах. І не рабіць акцэнт толькі на тых, хто ўжо атрымаў статус беспрацоўнага і вырашаць праблему з іх занятасцю.

У інстытуце займаюцца навукова-метадычным забеспячэннем падрыхтоўкі кадраў на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А сумесна з Мінпрацы ствараюць метадалогію і падыходы па навучанні і перанавучанні дарослых, у тым ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

— Па ўсёй краіне размеркавана каля 50 рэсурсных цэнтраў, дзе сканцэнтраваны самыя перадавыя тэхналогіі для ўсіх сектараў эканомікі. І педагогі, майстры патэнцыйна гатовыя навучаць не толькі моладзь, але і дарослых, — дадаў Валерый Галубоўскі. — І ў наступную пяцігодку з боку дзяржавы трэба распрацаваць і ўкараніць механізм фінансавання перанавучання працуючых.

**Ірына СІДАРОК.**

# НА СХОДЗЕ ПАВІННЫ ГУЧАЦЬ РОЗНЫЯ ПУНКТЫ ГЛЕДЖАННЯ




**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА назваў беспадстаўнымі прэтэнзіі некаторых асоб да паўнамоцтваў дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу.**

Ён паведаміў журналістам, што канкурэнцыя на выбарчых сходах была дастаткова вострая і ў форуме хацела ўзяць удзел вялікая колькасць людзей. Аднак магчымасць выказацца, данесці свой пункт гледжання была дадзена ўсім ахвотным — адной з асаблівасцяў падрыхтоўкі да цяперашняга УНС стала тое, што яна была шматступеньчатая.

«Пачалася з дыялогавых пляцовак (а іх больш за 1,2 тысячы), якія былі арганізаваны ў рэгіёнах. Там узяло актыўны ўдзел у абмеркаванні каля 35 тысяч чалавек. І ад іх паступіла каля 5 тысяч прапаноў на розныя тэмы. Кагосьці больш хвалявалі мясцовыя праблемы надзённага жыцця рэгіёна. Але было шмат сістэмных прапаноў, цікавых пагляду. Каля чвэрці з гэтых 5 тысяч пасля належнага аналізу былі абагульнены і далучаны да матэрыялаў сходу, у тым ліку пры падрыхтоўцы праекта даклада кіраўніка дзяржавы, пры ўдакладненні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны», — цытуе Рамана Галоўчанку БелТА.

Прэм'ер-міністр расказаў, якім чынам у VI Усебеларускім народным сходзе змогуць паўдзельнічаць прадстаўнікі альтэрнатыўных сіл.

«Прэзідэнт адназначна падкрэсліў, што на сходзе павінны гучаць розныя пункты гледжання, ён не павінен быць стэрыльным. Гэта значыць, там не павінна быць адсейвання непажаданых людзей. Вядома, практычна ўвесь склад дэлегатаў — гэта людзі, якія падтрымліваюць існуючы курс, выступаюць за моцную краіну, не жадаюць яе развалу, — сказаў прэм'ер-міністр. — Але, акрамя дэлегатаў, у складзе ёсць і запрошаныя. Калі дэлегатаў практычна 2,4 тысячы, то запрошаных плануецца больш за 300 чалавек. Яны будуць удзельнічаць у сходзе — не з'яўляцца дэлегатамі фармальна, не ўдзельнічаць у галасаванні, але тым не менш цалкам удзельнічаць у рабоце, мець права выступлення. Яны прадстаўляюць усе зарэгістраваныя палітычныя партыі. Запрашэнні накіроўваюцца. Хто з іх скарыстаецца запрашэннем?.. За выключэннем, вядома, тых, хто пераступіў закон і свядома стаў на іншы бок, парушыўшы тым самым заканадаўства Беларусі».

Раман Галоўчанка звярнуў увагу, што альтэрнатыўны пункт гледжання не абавязкова апазіцыйны. «Альтэрнатыўныя пункты гледжання гучалі і гучаць і падчас мерапрыемстваў, якія праводзяцца па падрыхтоўцы Усебеларускага народнага сходу. Часам нават вельмі альтэрнатыўныя. Але яны прадзяржаўныя. Яны накіраваныя на тое, каб зрабіць дзяржаву мацнейшай, больш устойлівай да знешніх пагроз», — растлумачыў ён.

На перыяд правядзення Усебеларускага народнага сходу будуць прынятыя ўсе неабходныя меры бяспекі, паведаміў кіраўнік Саўміна.

Ён адзначыў, што пры правядзенні падобных масавых мерапрыемстваў заўсёды прымяняюцца ўзмоцненыя меры бяспекі, у тым ліку па прадухіленні магчымых правакацый. Пра рэальную пагрозу для ўдзельнікаў форуму ракуль нішто не сведчыць, заявіў Раман Галоўчанка, тым не менш у асобных чатах выказваюцца заклікі да гвалту.

«Адпаведныя органы маюць план дзеянняў на ўсе выпадкі. План рэагавання ёсць на разнастайныя сцэнарыі, — падкрэсліў прэм'ер. — Думаю, ва ўсіх была магчымасць пераканацца, што праваахоўная сістэма Беларусі ў стане супрацьстаяць любым спробам дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне».

Спробы ж уздзеяння на дэлегатаў УНС з-за мяжы, пагрозы ім санкцыямі прэм'ер-міністр назваў «інструментам ганьбавання без разбору» і «непрыкрытым ціскам». «Што дыскрэдытуе прававую сістэму, у тым ліку краін і аб'яднанняў краін, якія выкарыстоўваюць гэтыя інструменты, — дадаў ён. — Пад удар трапляюць людзі, чыя «віна» заключаецца толькі ў тым, што яны кажуць не тое, што ад іх хочуць пачуць замежныя дзеячы».

Частка беларускіх грамадзян выступае за пераразмеркаванне эканамічных паўнамоцтваў цэнтра і рэгіёнаў. Такую выснову можна зрабіць па выніках правядзення ў краіне дыялогавых пляцовак, дадаў прэм'ер. У першую чаргу з пункту гледжання больш самастойнага распараджэння даходамі бюджэту, дэцэнтралізацыі ў прыняцці рашэнняў па выкарыстанні сродкаў бюджэту, індустрыялізацыі населеных пунктаў, рэалізацыі канкрэтных праектаў, якія накіраваны на стварэнне рабочых месцаў у рэгіёнах», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Разам з тым кіраўнік урада падкрэсліў, што гаворка ідзе не пра тое, каб забраць больш грошай у Мінскай вобласці і аддаць іх у іншыя рэгіёны, даходы якіх значна ніжэйшыя. «Задача рэгіёнаў заключаецца якраз у тым, каб развіваць бізнес, тэрыторыі, ствараць рабочыя месцы, атрымліваць больш падаткаў і даходаў ад нерухомасці, арэнды і гэтак далей. І менавіта за кошт гэтага павялічваць даходы ўласнага бюджэту, а не за кошт пераразмеркавання з больш прыбытковых рэгіёнаў», — сказаў прэм'ер-міністр.

«Наша мэта — фактычна індустрыялізацыя краіны. Не толькі прамысловая, але і сферы паслуг. Гэта значыць, мы павінны нарасціць інвестыцыі ў асноўны капітал, — дадаў Раман Галоўчанка. — Мы ўпершыню, напэўна, за ўвесь час пастараліся стварыць нацыянальны інфраструктурны план. Гэта больш за 800 аб'ектаў, якія будуць мадэрнізаваныя і створаныя ў наступную пяцігодку».

Кіраўнік урада распавёў, што дыялогавыя пляцоўкі, якія былі арганізаваны напярэдадні Усебеларускага народнага сходу, паказалі, што грамадзяне хочуць больш актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны, лічаць неабходным павысіць ролю парламента і ўзмацніць паўнамоцтвы мясцовых Саветаў дэпутатаў.

«Але, што цікава і што мы выдзелілі з гэтых дэбатаў і дыскусій, большасць людзей, дэлегатаў выступае за захаванне моцнай прэзідэнцкай улады. Гэта сведчыць аб тым, што няма настрою нешта зламаць», — сказаў прэм'ер-міністр.

Знайшло падтрымку сярод грамадзян і наданне канстытуцыйнага статусу Усебеларускаму народнаму сходу, адзначыў Раман Галоўчанка. Якой будзе роля УНС у будучыні і якімі паўнамоцтвамі ён будзе надзелены, трэба будзе абмеркаваць падчас маючага адбыцца форуму.

«Але агульная лінія зводзіцца да таго, што пры ўсіх гэтых навацыях мы не павінны аслабіць прэзідэнцкую ўладу, якая сцэментавала краіну і дазволіла выстаяць перад гэтым шалёным націскам, які мы ўсе нядаўна адчулі», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Праграма развіцця краіны, якая будзе абмяркоўвацца на УНС, па словах Рамана Галоўчанкі, не простая і не банальная, у ёй закладзена шмат новых ідэй. Аднак ім яшчэ трэба быць ухваленымі дэлегатамі форуму.

«Ужо нават падчас абмеркаванняў на абласных сходах паступала шмат не проста прапаноў, але і крытычных выказванняў, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Не сакрэт, што праграма распрацоўвалася ўрадам, і мы маем сваё бачанне на гэта. Але нейкія рэчы лепш бачныя з глыбіні, а не здалёк. Таму даводзіцца карэктаваць, і на самай справе цяпер уся сэнсавая работа накіраваная на тое, каб актуалізаваць праграму, якая была распрацавана ва ўрадзе, і ўлічыць усе крытычныя заўвагі, што паступаюць».

Раман Галоўчанка падкрэсліў: гэты дакумент павінен стаць фактычна дарожнай картай развіцця Беларусі, таму павінен быць напоўнены канкрэтным зместам.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Міграцыя ў Еўропу знізілася на траціну

Пандэмія каранавіруса значна скараціла міграцыю ў Еўропу ў цэлым, але на некаторых напрамках павялічыўся паток нелегальных мігрантаў. Аб гэтым сведчаць статыстычныя звесткі, якія апублікавала Еўрапейская камісія (ЕК). «Новыя даныя ЕС аб даванні прытулку і нелегальных пераходах мяжы за 10 месяцаў 2020 года паказваюць уплыў пандэміі на міграцыю ў ЕС, — адзначаецца ў паведамленні ЕК. — У цэлым на 33 працэнты менш зарэгістравана заяў аб даванні прытулку, а таксама дасягнуты шасцігадовы мінімум незаконных пераходаў (знешняй) мяжы». Аднак уплыў не быў раўнамерны, адзначаецца ў паведамленні. У некаторых месцах зарэгістравана нечакана вялікая колькасць прыбылых, і яна расла пасля значнага падзення ў красавіку. У асноўным зніжэнне — на маршруце з Турцыі ў Грэцыю. На фоне агульнага скарачэння паток нелегальных мігрантаў праз Цэнтральнае Міжземнамор'е (у Італію і Мальту) павялічыўся. У водах Міжземнага мора летась загінула або прапала без вестак звыш 1,7 тысячы чалавек.

### Рэкордны снегапад паралізаваў Нью-Ёрк



Нью-Ёрк накрыў небывалы снегапад. Школы закрытыя, мэрыя заклікала гараджан устрымацца ад паездак, паведаміў Euronews. Абвешчана надзвычайнае становішча, ва ўсіх аэрапортах мегаполіса былі адменены дзясяткі рэйсаў. З-за снегападу ў Нью-Ёрку прыпынена і кампанія па вакцынацыі ад каранавіруса. У мэрыі заклікалі жыхароў, у першую чаргу пажылых, па магчымасці не выходзіць з дому і не падвяргаць сябе небяспецы. Непагадзь абрынулася на цэнтральныя і паўночна-ўсходнія раёны ЗША яшчэ некалькі дзён таму. У Омасе і ў Небрасцы снегапад абвесцілі «гістарычным», адзначыўшы, што апошні раз нешта падобнае бачылі 15 гадоў таму. Паступова, паводле інфармацыі метэаролагаў, снежны шторм сышоў у бок акіяна.

На слыху

# Кампенсацыйныя меры

## Будуць прынятыя для недапушчэння росту цэн на лекі

**Неабходнасць прыняцця кампенсацыйных мер у сувязі з увядзеннем падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) з прычыны адмены падатковых ільгот і павелічэння ставак падатку на лекавыя сродкі разгледзелі ўчора на нарадзе ў Міністэрстве аховы здароўя з прадстаўнікамі Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў, айчыннымі вытворцамі лекавых сродкаў, прадстаўнікамі аптовых і рознічных фармацэўтычных кампаній. Вырашаць дадзеную праблему прапанавана сумеснымі намаганнямі, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.**

Нагадаем, што ў сувязі са зменяннямі ў Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь з 1 студзеня 2021 г. адбылася змена ўсталяванага заканадаўствам парадку збірання ПДВ па лекавых сродках і медыцынскіх вырабах, раней вызваленых ад названага падатку, а менавіта пры рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь такіх тавараў, пры іх увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь уведзена стаўка ПДВ у памеры 10 %.

**Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ** падзякаваў удзельнікам за работу ва ўмовах распаўсюджвання COVID-19. Паводле яго слоў, усе аператыўна зрэагавалі на патрэбы сістэмы аховы здароўя па пастаўках прэпаратаў, неабходнасць у якіх павялічылася ў сувязі з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі. Ён адзначыў, што цяпер крайне запатрабаваная работа ўстойлівага, збалансаванага рынку лекавых сродкаў. Дарэчы, па выніках мінулага года назіраўся рост аб'ёму рынку ў натуральным і грашовым выражэнні.

— Мы ахапілі шырокі спектр хвароб, якія можна лячыць з дапамогай новых лекавых прэпаратаў, пашырылі клінічныя пратаколы, рэспубліканскі фармуляр, пералік асноўных лекавых сродкаў. Часова дазволены інтэрнэт-гандаль па асобным спісе лекавых прэпаратаў, — сказаў Дзмітрый Піневіч.

Пры гэтым быў агучаны шэраг праблем, у тым ліку скарачэнне пераліку зарэгістраваных лекавых сродкаў, што ўплывае на Рэспубліканскі фармуляр і Пералік асноўных лекавых сродкаў. Прадстаўнікі кампаній адзначылі складанасць рэгістравання ў гэтых спісах. Сярод праблем — і кошт лекавых прэпаратаў, які часта перавышае цану ў рэферэнтных краінах, у прыватнасці ў Расійскай Федэрацыі. Усё гэта прыводзіць да імпарту лекавых прэпаратаў з суседніх краін.

Была разгледжана і неабходнасць прыняцця кампенсацыйных мер у сувязі з увядзеннем ПДВ у мэтах выканання аднаго з параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021 год — індэкса спажывецкіх цэн на сацыяльна значныя тавары не больш за 104,9. Вырашыць гэту праблему неабходна сумеснымі намаганнямі. Вытворцам прапанавана знізіць адпускныя цэны на 2 %. Пры фарміраванні аптовых і рознічных цэн знізіць памер надбавак, якія прымяняюцца, на 2 % на ўзроўні аптовага звяна і на 5-6 % — на ўзроўні рознічнай сеткі.

Міністр адзначыў, што колькасць аптэк няўхільна расце, што сведчыць пра дастатковую маржынальнасць дадзенай сферы дзейнасці. Таксама звярнулі ўвагу на тое, што нават з нулявой стаўкай прэпараты ў Беларусі былі даражэйшыя, чым у краінах, якія прымяняюць ПДВ у 10 % і нават у 20 %. У сукупнасці гэтыя факты сведчаць аб неабходнасці павышэння празрыстасці фарміравання цэн на лекавыя сродкі, а магчыма, і перагляду заканадаўства ў дадзенай сферы.

Была адзначана і задача павышэння празрыстасці працэдур дзяржаўных закупак, працэдур уключэння прэпаратаў у Рэспубліканскі фармуляр і Пералік асноўных лекавых сродкаў.

Са свайго боку, Міністэрства аховы здароўя будзе праводзіць работу па ўдасканаленні заканадаўства, ёсць зацікаўленасць у дыялогу з прадстаўнікамі фармбізнесу, гатоўнасць разглядаць любыя прапановы.

Адзначаны і станоўчы эфект укаранення новых працэдур рэгістрацыі лекавых прэпаратаў: спрошчанай (за паўгода па дадзенай працэдуры зарэгістравана больш за 20 прэпаратаў, у асноўным арыгінальных) і ўмоўнай (так зарэгістравана расійская вакцына ад каранавіруснай інфекцыі).

Распрацоўваецца пакет нарматыўных прававых актаў у сферы закупак лекавых прэпаратаў, якім плануецца пашырыць магчымасці па іх закупцы. Гэта заключэнне 2-3-гадовых кантрактаў, прымяненне гібкіх цэнавых мадэляў, праграм раздзялення рызык, закупкі лекавых сродкаў міжнародных спецыялізаваных арганізацый.

Таксама плануецца прадумаць магчымасць дазволу інтэрнэт-гандлю на пастаяннай аснове, прааналізаваць работу пашыранага пераліку лекавых прэпаратаў, якія адпускаюцца без рэцэпта ўрача.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Калектыў газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Сланеўскаму Анатолю Аркадзевічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**




# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ ПРАЕКТАВАННЕ, РОБАТАТЭХНІКА, ВОБЛАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

## Дырэктар тэхнапарка — пра магчымасці навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця ў буйных гарадах і глыбінцы

**Дзмітрый МАКАРУК узначальвае закрытае акцыянернае таварыства «Брэсцкі навукова-тэхналагічны парк». Дзмітрый Георгіевіч падзяліўся сваім бачаннем развіцця гэтага сектара эканомікі.**



— Сучасныя высокатэхналагічныя і індустрыяльныя зоны ў асноўным арыентаваныя на прадукцыйную мадэль, распрацоўку ўласнага высокатэхналагічнага прадукту. Калі звярнуцца да вопыту кітайскіх індустрыяльных і асабліва інавацыйных зон, якія цяпер актыўна развіваюцца і становяцца сусветнымі лідарамі, то варта адзначыць, што пры іх стварэнні ўпор рабіўся на IT, але затым акцэнт змясціўся на інавацыйныя галіны. Гэта найперш сістэма апрацоўкі даных і прагназаванне на падставе штучнага інтэлекту; разумныя прадпрыемствы з выкарыстаннем інтэрнэту рэчаў на аснове 5G — так званыя разумныя вытворчасці; новыя матэрыялы, робататэхніка і 3D-тэхналогіі; інтэрактыўны дызайн з выкарыстаннем тэхналогій дапоўненай і віртуальнай рэальнасці; квантавыя вылічэнні і іншае.

Ва ўказаных кірунках выкарыстанне IT мае прыкладны характар і не фарміруе такой дабаўленай вартасці, як 10—15 гадоў таму пры фарміраванні інтэрнэт-індустрыі. Мы ж спрабуем паўтарыць тое, што было актуальна раней. Нам неабходна адысці ад «даганяючай» мадэлі развіцця. Тым больш што інтэлектуальны рэсурс для гэтага маецца. Трэба выбіраць ключавыя магістральныя кірункі і рабіць акцэнт на іх. IT у гэтым адыгрывае вялізную ролю, але на гэтай базе трэба ствараць новыя прадукты і сэрвісы. Асабліва калі ўлічыць, што паспяховыя прыклады такіх рашэнняў у нас ёсць. Гэта ўкараненне лічбавых двайнікоў вытворчасцяў і робататэхнікі на такіх гігантах, як «Савушкін прадукт», «Санта Брэмар», «Пінскдрэў». У медыцыне рэгіёна ёсць прыклады стварэння сістэм кіравання ўстановамі аховы здароўя, базамі даных у службах пералівання крыві, праграма бяспекі медыкаў у «брудных» зонах ва ўмовах ковіду. Можна яшчэ назваць «разумнае» дыспетчараванне сістэмамі цепла- і энергазабеспячэння, аўтаматызаваны разлік паслуг ЖКГ і шмат іншага.

Аналіз магчымасцяў і інтэлектуальных рэсурсаў для Брэсцкай вобласці быў праведзены яшчэ ў 2018 годзе, тады быў распрацаваны праект «Зона інавацыйнага развіцця «Smart Brest» на аснове кластарнага фарміравання прадпрыемстваў і ўстаноў рэгіёна. Праект накіраваны на фарміраванне інавацыйнага цэнтра рэгіёна, заснаванага на разумных тэхналогіях. Кірункамі праекта вызначаны інтэлектуальнае праектаванне, 3D-друк, тэхналогіі дапоўненай і віртуальнай рэальнасці, а таксама робататэхніка, тэхналогіі штучнага інтэлекту, машыннага навучання і ўкараненне ў вытворчасць воблачных тэхналогій, цэнтр апрацоўкі вялікіх масіваў даных (Big Data) і забеспячэнне бяспекі захоўвання даных у «воблаку».

Для паскарэння рэалізацыі такіх праектаў трэба найперш павысіць ролю як сярэдняй, так і вышэйшай адукацыі. Ключавым фактарам павінна стаць скарачэнне разрыву паміж ведамі, атрыманымі ў навучальных установах, і патрэбамі прадпрыемстваў. У сістэме адукацыі важна ўкараняць падыходы праектнай і каманднай работы, методыкі, пабудаваныя на выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій. Напрыклад, базавыя праграмы па мовах праграмавання ў сярэдняй школе практычна не мяняліся за апошнія дзесяцігоддзі. Ды і пасля вышэйшай школы выпускнікі ў большасці выпадкаў давучваюцца на прадпрыемствах.

Фундаментам жа навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця могуць быць толькі ВНУ і навуковыя інстытуты. Для гэтага прапануецца ўкараніць у сістэму беларускага заканадаўства навацыю ў выглядзе арганізацыйна-прававой формы «спін-оф» (spin-off). Гэта патрэбна для навуковых і навучальных устаноў, бо там няма спрошчанай формы стварэння прадпрыемстваў. Таму і адбываецца адток самых перспектыўных кадраў у камерцыйныя структуры.

Другім важным элементам навукова-практычнага развіцця павінна стаць фарміраванне такой крыніцы фінансавання, як венчурны капітал. І тут асаблівая роля адводзіцца прыватнаму капіталу, для якога трэба стварыць адпаведныя стымулы, каб ён заставаўся і прымнажаўся ўнутры краіны. Венчурны капітал дасць рызыкоўным праектам права на памылку, што жыццёва важна пры ўкараненні новых тэхналогій.

Рэалізацыя выкладзеных прапаноў накіравана на стварэнне «разумных гарадоў», у якіх усе мы хочам жыць і працаваць. Гаворка цяпер ідзе не толькі пра развіццё буйных абласных і раённых цэнтраў. Маюцца на ўвазе таксама малыя гарады, асабліва тыя з іх, дзе ёсць плошчы і магутнасці, якія не выкарыстоўваюцца. Усё гэта можна перадаць у інавацыйныя зоны альбо існуючыя тэхнапаркі і ствараць цэнтры росту з улікам наяўных рэсурсаў і патэнцыялу. Варта адзначыць, што гэта работа не аднаго дня альбо года, але яе трэба пачынаць, інакш мы зноў рызыкуем спазніцца. Менавіта названыя праекты дазволяць утрымаць чалавека ў глыбінцы, папярэдзіць адток людзей у сталіцу, а то і наогул за мяжу.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «КАБ У ГАРАДКОЎ БЫЛА ДОБРАЯ ПЕРСПЕКТЫВА»

**Лідзія КРАЎЦОВА, настаўнік вышэйшай катэгорыі хіміі і біялогіі СШ № 1 г. Новалукомля, кіраўнік прафсаюзнай арганізацыі.**




Лідзія КРАЎЦОВА з вучаніцай Ксеніяй КАЗІНЕЦ.

— Я тутэйшая. Працую ў школе больш за трыццаць гадоў. Дарэчы, і сама атрымлівала тут веды. На сёння ў нашай навучальнай установе больш за 550 дзяцей і падлеткаў. Па тэхнічным забеспячэнні і ўмовах для заняткаў і правядзення вольнага часу школа адпавядае ўсім сучасным патрабаванням.

Я — класны кіраўнік у васьмікласнікаў. А мая вучаніца, адзінаццацікласніца Ксенія Казінец, у бягучым вучэбным годзе заваявала залаты медаль на малазійскай алімпіядзе навукова-даследчых работ. Мерапрыемствы правялі дыстанцыйна. Да гэтага Ксюша паспяхова брала ўдзел у рэспубліканскіх конкурсах. Адзін з навуковых інтарэсаў дзяўчыны — растварэнне бактэрыямі сілікатаў, вельмі перспектыўны кірунак у хіміі.

Як вопытнага настаўніка мяне турбуе пытанне «цякучкі» кадраў. Моладзь, адпрацоўваючы некалькі гадоў пасля атрымання дыплома, пакідае глыбінку. Зразумела, што на гэта ўплываюць і адсутнасць даплат, і праблемы з атрыманнем жылля. Таму хацелася б пачуць на сходзе разважанні па гэтым пытанні.

Як біёлаг, які шмат часу аддаў вывучэнню мясцовай экалогіі, думаю, што трэба актыўна развіваць турыстычную галіну. Ва ўсім свеце турызм — вельмі прыбытковы бізнес, таму, упэўнена, і ў нашым горадзе можна было б добра «развярнуцца» ў гэтым кірунку.

Безумоўна, магчымасць удзелу ў сходзе для мяне вялікі гонар. Адчуваю, што буду сведкам важных абмеркаванняў, прыняцця папярэдніх рашэнняў, перспектыўных стратэгій.

І вельмі хочацца, каб усе мы, асабліва моладзь і дзеці, яшчэ больш ганарыліся тым, што жывём там, дзе спакойна, дзе ёсць магчымасць развівацца, рэалізоўваць свае таленты, бізнес-планы, добра зарабляць.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «Які будзе настаўнік, такая будзе і краіна»

**Вікторыя КУМІШЧА, дырэктар сярэдняй школы ў аграгарадку Занарач, дэпутат Занарачанскага сельскага Савета Мядзельскага раёна.**



Фота БелТА.

— Да Усебеларускага народнага сходу, зразумела, рыхтуюся актыўна. Да яго ўдзельнікаў хачу данесці не толькі свае думкі і прапановы, але таксама ідэі, меркаванні і падыходы аднавяскоўцаў і калег па педагагічнай рабоце, расказаць аб тым, што людзей хвалюе больш за ўсё. Лічу, што на сходзе разам трэба моцна падумаць над тым, як узняць на новы ўзровень эфектыўнасць школьнай адукацыі.

Так, размоў на гэтую тэму шмат, але і пытанняў без адказаў застаецца таксама не менш. Вядома, усе мы, дарослыя, і не толькі настаўнікі, заклапочаны выхаваннем падрастаючага пакалення. І ў гэтай справе, безумоўна, галоўная роля належыць сям'і. Тут закладваюцца рысы характару будучай асобы, адбываецца яе станаўленне. Роля сям'і — тэма асобнай вялікай размовы, а сёння хочацца пагаварыць пра школьную адукацыю і месца настаўніка ў ёй. Яно, гэтае месца, безумоўна, ключавое, цэнтральнае і г. д. Але, думаю, што далёка не ўсе нашы суграмадзяне выразна ўсведамляюць ролю педагога не толькі ў навучанні іх дзяцей, але і ў цэлым у грамадстве.

Праўда, апошнім часам сітуацыя змяняецца, дзяржава аддае больш увагі вырашэнню праблем школы ўвогуле і настаўнікаў у прыватнасці. У ходзе падрыхтоўкі да сходу нельга не прыгадаць усё тое добрае, што адбылося ў нашым аграгарадку Занарач за час пасля папярэдняга Усебеларускага народнага сходу. І адразу ўспамінаецца, як летась у святочнай атмасферы мы адкрывалі новы будынак сярэдняй школы. Аб тым, што гэта падзея далёка не мясцовага маштабу, сведчыць і той факт, што ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічаў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын.

Будынак старой школы, у якой дзеці вучыліся ў дзве змены, ужо даўно ўстарэў фізічна і маральна, быў цесны і нязручны. На яго рамонт і рэканструкцыю прыйшлося б выдаткаваць сродкаў амаль столькі ж, колькі на ўзвядзенне новага аб'екта. Дарэчы, будаўніцтва школы абышлося ў суму больш за 4,5 мільёна рублёў з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Немалыя грошы для сельскай мясцовасці. Але, думаю, было прынята правільнае рашэнне будаваць у Занарачы сучасную школу, якая адпавядала б сённяшнім высокім патрабаванням да ўмоў для навучання дзяцей і падлеткаў.

Мяркуйце самі. Новая школа разлічана на 108 месцаў. У ёй створаны сучасныя навучальныя кабінеты, лінгафонны кабінет, камп'ютарны клас, спартыўная зала, бібліятэка, ёсць харчовы блок са сталовай, медыцынскі кабінет, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, куток «Сямейная гасцёўня» для работы «бацькоўскага ўніверсітэта». Вучні старэйшых класаў побач са школай залажылі сад: пасадзілі 45 яблынь і груш.

Што казаць, цудоўныя ўмовы для работы вясковага настаўніка. І тым не менш мяне хвалюе пытанне, як надалей павышаць яго прэстыж у грамадстве? Пра гэта дэлегатам сходу варта падумаць разам. На мой погляд, ліміт часу на заклікі ўжо скончыўся. Упэўнена, што ў тэкст выніковых дакументаў сходу варта запісаць рашэнні, якія маглі б аблегчыць работу настаўніка і павысілі б прэстыж прафесіі, што звязана не толькі з ростам зарплаты, пашырэннем ільгот для сельскіх педагогаў. Гэта толькі частка праблемы.

На сходзе трэба абмеркаваць наступныя пытанні: як палепшыць прафесійны адбор для жадаючых паступіць у педагагічныя ВНУ краіны і павялічыць колькасць бюджэтных месцаў на педагагічныя спецыяльнасці. Як шырэй выкарыстоўваць магчымасці сродкаў масавай інфармацыі, кіно і сацыяльнай рэкламы для фарміравання пазітыўнага вобраза настаўніка, як вызваліць яго ад «мора» папер для абавязковага запаўнення.

Своечасовыя адказы на гэтыя пытанні дазволяць значна ўзмацніць кадравы патэнцыял настаўніцкага корпуса краіны, прыцягнуць на работу ў школы таленавітую моладзь.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# Гомельшчына: пункты росту і каштоўныя рэзервы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Эканамічная палітыка Гомельскай вобласці стала захоўвае курс збалансаванага развіцця, асноўная мэта якога — павышэнне якасці жыцця людзей. За пяць гадоў рэальная заработная плата ў рэгіёне вырасла больш як на чвэрць, а па выніках 2020 года і дасягнула 1100 рублёў. За гэты перыяд у вобласці было ўведзена ў эксплуатацыю 2 мільёны 400 тысяч квадратных метраў жылля.

**Гандлёвыя плошчы рэгіёна за мінулую пяцігодку павялічыліся на 340 тысяч квадратных метраў. Рознічны тавараабарот вырас на 12,8 %.**

Інвестыцыі ў асноўны капітал у 2016—2020 гадах перавысілі 8 мільярдаў долараў ЗША. Экспарт тавараў і паслуг павялічыўся на 14,2 %, ён склаў больш 20 мільярдаў долараў ЗША. Доля Гомельшчыны ў агульным аб'ёме экспарту тавараў Беларусі займае 13 %. Удзельная вага рэгіёна ў агульнарэспубліканскім аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал — звыш 14 %. У развіццё вытворчасці і сферы паслуг інвеставана больш за 8 мільярдаў долараў ЗША. Замежныя інвестыцыі, прыцягнутыя ў эканоміку рэгіёна на працягу 2016—2020 гадоў, склалі больш як пяць мільярдаў долараў ЗША, звыш $500 млн — прамыя інвестыцыі на чыстай аснове.

### КАМБАЙНЫ, НАФТА, ЦЭЛЮЛОЗА

У вобласці валавы рэгіянальны прадукт за мінулую пяцігодку склаў 61,4 мільярда рублёў. Між тым звыш 40 % гэтага паказчыка фарміруе прамысловы комплекс рэгіёна. За адзначаны час аб'ём прамысловай вытворчасці тут вырас на 5,5 % і склаў 102 мільярды рублёў. Гэта вынік работы больш чым 220 буйных і сярэдніх, а таксама больш чым тысячы малых прадпрыемстваў. Усе яны складаюць пятую частку індустрыяльнага патэнцыялу краіны. У Гомельскай вобласці здабываецца ўся беларуская нафта, газ, вырабляецца беларуская цэлюлоза, больш за палову камбайнаў, сталі і шмат іншай прадукцыі.

### УНІКАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ

ААТ «Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія» рэалізаваны маштабны праект па павелічэнні магутнасцяў пазапечнай апрацоўкі сталі. ААТ «Гомельшкло» ў межах інвестпраекта асвоіла выпуск новых відаў і памераў шкла, у тым ліку з адмысловымі ўласцівасцямі. Была праведзена мадэрнізацыя ліній па вытворчасці паліраванага шкла і прамысловай перапрацоўцы шкла. ААТ «Мазырсоль» праведзена рэканструкцыя існуючых магутнасцяў з павелічэннем вытворчасці да 480 тысяч тон солі ў год. ААТ «Светлагорскі ЦКК» пабудаваны завод па вытворчасці бялёнай цэлюлозы магутнасцю 400 тысяч тон у год. Гэта абсалютна новы прадукт для нашай краіны, звыш 80 % якога пастаўляецца на экспарт, пры гэтым поўнасцю забяспечваюцца патрэбы айчынных прадпрыемстваў.

### МАШТАБНАЕ ПЕРАЎЗБРАЕННЕ

У 2016 годзе ААТ «Рэчыцадрэў» рэалізавала мадэрнізацыю вытворчасці драўнянастружкавых пліт. ААТ «Гомельдрэў» выканана рэканструкцыя і развіццё вытворчасцяў з укараненнем комплексу энергазберагальных мерапрыемстваў, арганізавана вытворчасць драўнянавалакністых пліт. У наступныя пяць гадоў мы будзем працягваць работу над павелічэннем вытворчасці і экспарту высокамаржынальнай прадукцыі лесаперапрацоўкі.

### АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ЭНЕРГЕТЫКА

За пяцігодку пабудаваных тры сонечныя паркі ў Ельскім і Брагінскім раёнах, уведзены ў эксплуатацыю фотаэлектрастанцыі і гідраэлектрастанцыя на рацэ Іпуць у Добрушы. Сумарная магутнасць гэтых праектаў 95 МВт.



### ТРЭНДЫ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У 2019 ААТ «Тураўскі малочны камбінат» павялічыла вытворчыя магутнасці па перапрацоўцы сыравіны. ВУП «Калінкавіцкі малочны камбінат» асвоіла на базе Светлагорскага філіяла вытворчасць сычужных сыроў і малочнай канцэнтраванай сыроваткі. ААТ «Спартак» наладжана вытворчасць новых відаў вафельных вырабаў. На працягу 2016—2020 гадоў ААТ «Мілкавіта» ажыццявіла тэхнічнае пераўзбраенне і мадэрнізацыю асноўнай вытворчасці, рэканструкцыю кампрэсарнага цэха, будаўніцтва лакальных ачышчальных збудаванняў.

### 2,5 МЛН «КВАДРАТАЎ» ЖЫЛЛЯ

На 1 студзеня бягучага года забяспечанасць жыллём насельніцтва ў рэгіёне перавысіла 27 квадратных метраў на чалавека. На будучую пяцігодку запланаваны ўвод 2 мільёнаў 500 тысяч квадратных метраў жылля за кошт усіх крыніц фінансавання. Па выніках мінулай пяцігодкі аб'ём будаўніча-мантажных работ у рэгіёне склаў больш за 9 мільярдаў рублёў. Аб'ём падрадных работ — больш за 6 мільярдаў рублёў. Экспарт будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг — 360 мільёнаў долараў ЗША.

### УВАГА «САЦЫЯЛЦЫ»

У рэгіёне 18,5 тысячы шматдзетных сем'яў. За апошнія пяць гадоў было адкрыта звыш 15 тысяч дэпазітаў на сямейны капітал. У сферы аховы здароўя вобласці пачынаючы з 2015 года праведзены рамонтныя работы на агульную суму звыш 128 мільёнаў рублёў. Набыта медыцынскага абсталявання на 76,5 мільёна рублёў. З 2015 года ўзровень праводзімых складаных аперацыйных умяшанняў узрос на 43 %. Штогод у рэгіёне выконваецца звыш 7 тысяч высокатэхналагічных медыцынскіх умяшанняў.

У рэгіёне працуе 85 спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў. За 2016—2020 гады падрыхтавана 475 майстроў спорту, 79 майстроў спорту міжнароднага класа. Спартсмены Гомельшчыны за апошнія 5 гадоў заваявалі на міжнародных стартах і спаборніцтвах 532 медалі.

### АРЫЕНЦІРЫ НА ПЯЦІГОДКУ

У фінальнай стадыі знаходзіцца будаўніцтва Петрыкаўскага горнаўзбагачальнага камбіната. Сёння практычна завершана будаўніцтва асноўных аб'ектаў — рудніка і абагачальнай фабрыкі, вядзецца мантаж абсталявання і пусканаладачныя работы. У бягучым годзе ААТ «Беларуськалій» рэалізуе прамысловую распрацоўку Петрыкаўскага радовішча калійных солей з будаўніцтвам і ўводам у эксплуатацыю горнаўзбагачальнага комплексу магутнасцю 1,5 мільёна тон хларыду калію ў год.



ААТ «Мазырскі НПЗ» намечана будаўніцтва комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў. Як вынік, рэгіён атрымае вытворчасць і глыбіню перапрацоўкі нафты — 90 %, а доля светлых нафтапрадуктаў у агульным аб'ёме вытворчасці будзе даведзена да 70 %, што ў сваю чаргу прынясе дадатковую валютную выручку.

У 2021 годзе на базе філіяла «Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры» пройдзе тэхнічнае перааснашчэнне з арганізацыяй вытворчасці мелаваных і немелаваных відаў кардону. На працягу наступных трох гадоў на ААТ «Гомельскі хімічны завод» запланавана рэалізацыя праектаў будаўніцтва, рэканструкцыі і тэхнічнай мадэрнізацыі існуючай вытворчасці.

Калі казаць пра рэалізацыю інвестпраектаў з прыцягненнем замежнага капіталу, то трэба адзначыць вытворчасць вырабаў медыцынскага прызначэння прадпрыемствам «Алкапак», будаўніцтва вытворчага корпуса па выпуску біяраскладальнага аднаразовага посуду з фармованай цэлюлозы на прадпрыемстве «Палікап», пашырэнне дзеючай вытворчасці і будаўніцтва вытворча-складскога комплексу ТАА «ДЭЛКАМ40», пашырэнне і будаўніцтва цэха металаапрацоўкі ЗВУП «Веза-Г», будаўніцтва дрэваперапрацоўчага завода прадпрыемствам «Мазырскі лесазавод».

**У жыллёва-камунальнай гаспадарцы Гомельшчыны за мінулыя пяць гадоў было рэканструявана 184 кацельні, пабудавана 114 станцый абезжалезвання вады.**

### ГЕАГРАФІЯ — 110 КРАІН

Геаграфія краін — знешнегандлёвых партнёраў вобласці ў 2020 годзе дасягнула 110. У дыверсіфікацыі наша задача была і застаецца: не дапусціць зніжэння прысутнасці на традыцыйных рынках і адначасова павялічваць аб'ёмы экспарту ў краіны дальняй дугі. Так, летась у краіны Еўрапейскага саюза экспартавана 29 % тавараў, Еўразійскага эканамічнага саюза — 41 %, у краіны далёкай дугі (Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі) — 30 %. Прычым доля апошняга напрамку вырасла за мінулае пяцігоддзе амаль удвая. Паспяхова асвойваюць прадпрыемствы вобласці рынак Кітайскай Народнай Рэспублікі. У 13 разоў за пяцігодку вырас экспарт у КНР. Летась на гэты рынак пастаўлена прадукцыі на амаль 90 мільёнаў долараў. Рост за мінулы год склаў 40 %.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота БелТА.**

**За мінулую пяцігодку Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам і Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў заключана 27 пагадненняў аб узаемадзеянні ў гандлёва-эканамінай, гуманітарнай сферах з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі 20 краін свету. Падпісаны 31 дагавор аб пабрацімстве адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Гомельскай вобласці з рэгіёнамі 21 краіны.**



# Беларуская кніга мусіць быць для нас прыярытэтам

## Пра крызіс сусветнага кніжнага гандлю

**В. Глухоўская:** На жаль, увесь мінулы год мы назіралі спад продажаў, асабліва ў красавіку-маі, тады зніжэнне было каля 40 працэнтаў. Тым не менш наш калектыў выстаяў, сітуацыя стала выраўноўвацца, але навярстаць упушчаныя продажы было вельмі складана. Сказаўся і эканамічны крызіс, які закрануў усе краіны. І па выніках года спад продажаў у нашай краме — каля 15 працэнтаў. Ад калег ведаю, што такая з'ява закранула асноўную частку кніжных магазінаў, у тым ліку і інтэрнэт-гандаль. Некаторыя інтэрнэт-крамы нават пераключыліся з кніг на прадукты харчавання. Гэта звязана і з тым, што расійскія выдавецтвы скарацілі выпуск прадукцыі. Але паколькі «Акадэмічная кніга» больш арыентуецца на беларускія выданні, у нас сітуацыя лепшая. Беларускія выдавецтвы, у першую чаргу дзяржаўныя, такія, як «Беларуская навука», «Звязда», «Мастацкая літаратура», «Беларусь», «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» — выпусцілі шмат навінак, і дзякуючы ім крама някепска папрацавала.

**А. Суша:** Сітуацыя не вельмі радасная ва ўсім свеце. Нават калі зірнуць на Расію — а так гістарычна склалася, што яна з'яўляецца асноўным партнёрам Беларусі ў кнігагандлі. Ужо ўвесну там быў татальны крызіс у гэтай сферы. У сакавіку кіраўніцтва Расійскага кніжнага саюза звярнулася да ўрада з просьбай аб дапамозе, бо ў іх чакаліся вялікія страты ў сферы кніжнага гандлю. Атрымалася значна больш. Вясной у Расіі былі закрытыя многія кніжныя крамы, спачатку нібыта на кароткі час, потым гэта прадоўжылася. Увосень было бачна, што ніякія электронныя формы гандлю не здольныя кампенсаваць страты ў продажах фізічных. Тым больш не назіралася палёгкі для кнігагандлёвай сферы, не былі зменшаны арэндныя выплаты. Бо лічыцца, што кніга — не тавар першай неабходнасці, сур'ёзныя датацыі былі скіраваныя на іншыя тавары.

**Л. Рублеўская:** Але кажуць, што вырас попыт на электронную кнігу, а ў Расіі гэты рынак вельмі развіты...

**А. Суша:** Сапраўды, у свеце ёсць тэндэнцыя росту попыту на электронныя кнігі альбо электроннага гандлю фізічнымі выданнямі. Але ён не настолькі імклівы, каб кампенсаваць страты. Вы ж бачыце праз навіны, у той жа Францыі, Італіі — спрэс закрытыя кніжныя крамы. Калі летам іх спрабавалі адчыніць, з'явіліся вельмі жорсткія абмежаванні — на колькасць людзей, якія могуць у краме знаходзіцца, на спосабы, як выстаўляць прадукцыю. А яшчэ страты ў сувязі з ростам кошту на паперу, з мытнымі працэдурамі, з абмежаваннямі на міжнародны гандаль, складанасцямі з лагістыкай праз закрыццё граніц.

**В. Глухоўская:** Мы страцілі ў безнаяўных продажах — менш сталі закупляцца ў нас арганізацыі, бібліятэкі. Частка арганізацый ліквідавалася альбо скараціла выдаткі. Перасталі ў нас набываць і карпаратыўныя падарункі, бо канферэнцыі і семінары пачалі праходзіць у анлайн-фармаце. Але галоўнае, пацвердзілася наша стратэгія — найперш работа з беларускімі выдавецтвамі, збор малатыражных выданняў, надрукаваных не ў Мінску, акумуляванне іх на паліцах нашага магазіна. Я лічу, што менавіта беларускі вытворца і можа нам дапамагчы вытрываць гэтую сітуацыю. Цікавасць да беларускай кнігі ў нашых пакупнікоў дастаткова высокая.

## Пра аўтограф-сесіі ў час пандэміі

**В. Глухоўская:** Нашы пакупнікі сёння не гатовыя да такой жорсткай змены фармату. Вядома, на нейкі час мы прыпынілі ў магазіне нашы цудоўныя сустрэчы з аўтарамі. Але людзі адаптуюцца паціху да той сітуацыі, у якой апынуліся, і з захаваннем усіх мер бяспекі сустрэчы час ад часу праводзім. Першая такая была ў чэрвені, нам вельмі дзякавалі і тыя, хто прыйшоў, і тыя, хто чытаў пра гэтую сустрэчу ў інтэрнэце. Усім хочацца вярнуцца да звыклага жыцця. Сёння ў нас рэалізавалася цікавая ідэя.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Пачалося з каляднага распродажу кніг з аўтографамі аўтараў. А сёння ў краме арганізавана на пастаяннай аснове паліца кніг з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў, што таксама неяк кампенсуе адсутнасць жывых сустрэч.

**Л. Рублеўская:** Пісьменнікі з гора актыўна пайшлі ў сеціва, паназапісвалі відэаролікаў, у якіх агучваюць свае творы. Далучыліся да гэтага трэнду і бібліятэкі. Кніжныя блогеры актывізаваліся...

**А. Суша:** Вельмі многія нашы мерапрыемствы — канферэнцыі, круглыя сталы, прэзэнтацыі, чытанні і іншыя — перайшлі ў віртуальную форму. Праз гэта атрымалася не толькі правесці супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы і важныя запланаваныя загадзя акцыі, але і захаваць аўдыторыю. Больш за тое, спалучэнне рэальных і віртуальных формаў работы прывяло да з'яўлення многіх новых кантактаў і праектаў. Напрыклад, колькасць праглядаў сёлетніх Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія праходзілі з жывой трансляцыяй на YouTube і сацыяльных сетках, за тыдзень перайшла ў дзясяткі тысяч. Летась мы праводзілі конкурсы буктрэйлераў, анлайн-прэзентацыі, рэальна-віртуальныя семінары і круглыя сталы. Магу згадаць рэзанансны конкурс пастараў і эсэ для школьнікаў, прысвечаны юбілею Рыгора Барадуліна, а таксама абсалютна ўнікальны конкурс чытальнікаў вершаваных работ Уладзіміра Дубоўкі. Так, на апошні з названых конкурсаў мы атрымалі больш 880 (!) відэаработ з усіх куточкаў Беларусі і з-за мяжы, удзельнікамі былі аматары і прафесіяналы ва ўзросце ад пяці да 85 гадоў. Паверце, гэта выключны вынік.

**Л. Рублеўская:** А ці змяніліся чытацкія інтарэсы і ці ўплывае на іх такая вось работа з аўтарам?

**В. Глухоўская:** У нашай краме ахвотна купляюць усё, што датычыцца краязнаўства, гісторыі Беларусі. Кніга пра малюнкі і чарцяжы Януша Радзівіла выдавецтва «Беларусь» разышлася, запатрабаваны альбом таго ж выдавецтва пра Напалеона Орду, падрыхтаваны Алесем Сушам. Вельмі добра раскуплялася пяцітомнае выданне па гісторыі беларускай дзяржаўнасці выдавецтва «Беларуская навука», праваавая літаратура. Але любая кніга, якая паступае ў краму, павінна атрымаць свой анонс, сваю долю ўвагі. І аўтограф-сесіі — вельмі добры спосаб.

## Пра электронныя кнігі

**Л. Рублеўская:** А вось звычайная кніжная крама, накшталт «Акадэмічнай кнігі», можа паралельна з папяровай прадукцыяй гандляваць электроннымі кнігамі?

**В. Глухоўская:** Электронную кнігу павінен прапаноўваць выдавец. Сёння адзінкавыя выдавецтвы выпускаюць электронныя кнігі. Нам яны не прапаноўваюць механізм продажаў. Ну і што мяне не задавальняе на сусветным рынку электронных кніг — няма дэмпінгу цэн. Розніца паміж коштам электроннай і папяровай кнігі можа складаць адзін-два еўра. Гэта менш чым пяць працэнтаў ад кошту кнігі. У нас кніга друкаваная можа каштаваць каля дзесяці—дваццаці долараў, а электронная — трыпяць.

**А. Суша:** Некалькі выдаўцоў спрабавала ў нас займацца гандлем электроннай кнігай, але не скажу, каб вельмі паспяхова. Некаторыя перадавалі правы на продаж кніг сваіх аўтараў замежным кнігагандлёвым электронным пляцоўкам, але ў выніку не былі задаволеныя. Нашы аўтары не вельмі добра там прадаюцца, бо беларускую кнігу адшукаць там сярод іншага цяжка. Няма ў нас ні абавязковага бясплатнага асобніка электронных выданняў, няма электроннай нацыянальнай бібліятэкі.

**Л. Рублеўская:** У нас няма і культуры набываць электронныя кнігі. Усё звыклі спампоўваць пірацкімі метадамі, не разумеюць, чаму павінны плаціць за тое, што могуць займець бясплатна. Аднойчы толькі чытачка мне напісала, прасіла даць спасылкі, дзе купіць мае кнігі ў электронным выглядзе, бо для яе было прынцыпова набыць іх афіцыйна.

**В. Глухоўская:** Людзі часта, прызнаючыся ў любові да таго ці іншага пісьменніка, лічаць за лепшае спампаваць пірацкую версію яго кнігі, не разумеючы, якія велізарныя затраты часу і сіл аднімае гэтае «хобі». Бо ў Беларусі практычна адзінкавыя аўтары зарабляюць толькі літаратурай. Большая іх частка займаецца пісьменніцтвам у вольны час, і ўсе затраты на паездкі, работу ў архівах — за ўласны кошт. І ганарары ў нас практычна сімвалічныя. І я прынцыпова ніводнай пірацкай версіі кнігі ў інтэрнэце не прачытала. Вельмі хацелася б, каб з боку бібліятэк, кніжных крам, СМІ ішла асветніцкая работа накont таго, што карыстацца працай пісьменікаў бясплатна — непрыгожа. Патрэбна абарона аўтарскіх правоў, а караць за спампаванне пірацкага кантэнту трэба ў першую чаргу не тых, хто яго змяшчае, а тых, хто яго спажывае.

**Л. Рублеўская:** У мяне да гэтага дваістае стаўленне... Беларускія літаратары заўсёды займаліся асветніцкай дзейнасцю, асабліва ў тым, што датычыцца папулярызацыі гісторыі, выхавання нацыянальнай свядомасці... А для гэтых мэт патрэбны вольны доступ да адпаведных тэкстаў.

**В. Глухоўская:** Ну дык на гэта ёсць добрая воля аўтара — выкласці свой тэкст у сеціва для бясплатнага карыстання.

**А. Суша:** Наша бібліятэка як дзяржаўная ўстанова і юрыдычная асоба не можа працаваць з нелегальным кантэнтам. У нас ёсць заканадаўства аб аўтарскім праве і сумежных правах, вельмі няблага выбудаванае, адным з распрацоўшчыкаў яго былі мы. Іншая справа, што немагчыма аўтару ці выдаўцу адсочваць кожны выпадак незаконнага карыстання інтэлектуальнай уласнасцю. У замежнага чытача выхавана разуменне, што любая праца — пісьменніка, рэдактара, паліграфіста — мусіць аплачвацца, і амаральна карыстацца ёю бясплатна. У нашага чытача такога ўсведамлення трохі бракуе. Так, ёсць у нас Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, там ёсць структура, якая займаецца калектыўным кіраваннем аўтарскімі правамі. Але ў цэлым гэтая сфера ў нас слаба развітая, і мала прэцэдэнтаў паспяховай абароны аўтарскіх правоў. І ўсё ж праваавая культура насельніцтва расце, і запатрабаванасць у легальным доступе да інфармацыі — таксама.

## Пра тое, як змяняюцца кнігарні

**Л. Рублеўская:** Мы неаднойчы ў мінулыя гады абмяркоўвалі новыя формы распаўсюджвання кніг. Гаварылі пра кнігарні-кавярні, кнігарні-клубы, кнігарні-канцэртныя залы...

**А. Суша:** Інтэграцыя «кнігарня-чытальня», «кнігарня-кавярня» ва ўмовах ковіду не працуе. Кавярні сёння ў такім жа цяжкім стане, як і кніжныя крамы.

**В. Глухоўская:** У маладосці мой любімы адпачынак быў — зайсці ў Цэнтральную кніжную кнігарню, купіць кнігу, а потым у кавярні па той бок праспекта піць каву і чытаць. На мой погляд, нашы кніжныя крамы размешчаны ў занадта маленькіх памяшканнях, акрамя крамы «Светач» ды адзінкавых іншых, для таго каб гандлёвую плошчу аддаваць пад кавярню і выкарыстоўваць іншыя модныя тэндэнцыі.

**А. Суша:** Мінулы год больш змяніў механізмы работы і для бібліятэк, і для кнігагандлёвых арганізацый. Якія дзейсныя? Індывідуалізацыя работы з кнігамі. Мэтавая рэклама. Дарэчы, рэклама мяняе прастору — цяпер найперш гэта інтэрнэт. Рэклама ў гарадской прасторы застаецца, але галоўнае — сеціва, сацыяльныя сеткі. Больш далучаюцца да прасоўвання кнігі выдаўцы, кнігарні.

**В. Глухоўская:** Мы ўвесь час кансультуем сваіх чытачоў, нашаму меркаванню давяраюць. Прыцягвае і паліца кніг з аўтографамі: для чытача гэта прыемны бонус. Магчыма, праз месяц запусцім у тэставым рэжыме інтэрнэт-магазін «Акадэмічная кніга». Вядома, ён не будзе альтэрнатывай існуючым інтэрнэт-крамам, хутчэй — гэта электронная пляцоўка, дзе можна азнаёміцца з нашай прадукцыяй, замовіць яе і праз электронны кашалёк аплаціць. Дастаўка кур'ерам будзе для буйных заказаў, але і цяпер нашу прадукцыю можна набыць па пошце.

## Пра кнігу на роднай мове

**Л. Рублеўская:** І яшчэ адна змена... Хочацца верыць, што пачалі больш чытаць беларускамоўную літаратуру.

**А. Суша:** Моўная праблема існуе, і яна вельмі істотна ўплывае на кніжны рынак Беларусі. Немагчыма адмаўляць, што беларускамоўная літаратура малазапатрабаваная ў пэўных сегментах грамадства. Яна ў сусветным маштабе неканкурэнтаздольная ў параўнанні з рускамоўнай ці англамоўнай. Чаму той жа літоўскі кніжны рынак развіваецца больш актыўна? Таму што яны не залежаць ад расійскага кніжнага рынку. У Беларусі, калі перакласці і выдаць на беларускай мове, напрыклад, Арыстоцеля — гэта не акупіцца. У Літве выдаваць Арыстоцеля на літоўскай мове сэнс ёсць, бо ў любой навучальнай установе яго вывучаюць на літоўскай. Больш за тое, работа над перакладам Арыстоцеля на літоўскую мову вядзе да стварэння навуковай школы па вывучэнні яго філасофіі, а гэта спрыяе ўзнікненню новых публікацый, новых канферэнцый, новай прафесійнай камунікацыі, а не звычайнаму перайманню замежных узораў. Беларускаму выдаўцу цяжка знайсці месца, дзе з ім не будуць канкурыраваць расійскія выданні. Калі мы зойдзем у любую кнігарню, убачым там у асноўным расійскую кнігу. Ёсць у нас і такая рыса: адсутнасць палітры замежнай літаратуры, бо мы атрымліваем навінкі праз расійскі кніжны рынак. Што там пераклалі, што да нас завезлі — тое ў нас і ёсць. Многае з таго, што ствараецца ў свеце, да нас не даходзіць.

**Л. Рублеўская:** Менавіта гэта апошнім часам паспрабавалі выправіць асобныя беларускія выдавецтвы, асабліва прыватныя, з'явіўся сапраўдны бум на пераклад сусветных бестселераў на беларускую мову, і ён знайшоў чытацкі водгук.

**В. Глухоўская:** Сітуацыя з выданнем перакладаў мастацкай літаратуры на беларускую мову дадае аптымізму, але мы яшчэ вельмі далёкія ад таго, што кніга будзе выдавацца і прадавацца ў нас адразу на дзвюх — рускай і беларускай — мовах адначасова. Велізарная колькасць твораў сусветнай літаратуры яшчэ не перакладзена на беларускую мову, і большая частка твораў на беларускай мове ніколі не перакладалася на рускую.

**Л. Рублеўская:** Прынамсі, Уладзімір Караткевіч верыў у тое, што беларусы зберагуць свае кнігі.

*...Кнігі — сябры.*
*Іх кідаюць перш за ўсё.*
*Але ўсё ж Чалавек*
*Выходзіць пад бомбы ў дарогу,*
*Захапіўшы з сабой*
*Акрым шчоткі зубной*
*Багдановіча, Танка, Купалу,*
*І Коласа, й Панчанку,*
*І Эклезіяста,*
*І — ў сэрцы — бога.*

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

На слыху

## КОЛЬКАСЦЬ ВЫПАДКАЎ COVID-19 У СВЕЦЕ ЗНІЖАЕЦЦА

**Каранавіруснай інфекцыяй можна кіраваць. Такое меркаванне выказаў генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Тэдрас Гебрэесус на брыфінгу.**

Ён нагадаў, што колькасць новых выпадкаў COVID-19 ва ўсім свеце зніжаецца ўжо трэці тыдзень запар. І хоць ёсць краіны з ростам захваральнасці, на глабальным узроўні гэта з'яўляецца абнадзейлівай навіной.

«Гэта дэманструе, што вірусам можна кіраваць нават з улікам пашырэння яго новых варыянтаў. Гэта паказвае, што мы можам прадухіліць інфіцыраванне і ратаваць жыцці, калі працягнем выконваць ужо праверaныя меры па ахове здароўя грамадства», — заявіў Тэдрас Гебрэесус.

Пры гэтым ён нагадаў, што свет ужо сутыкаўся са зніжэннем захваральнасці на каранавірусную інфекцыю, адзначыўшы, што тады краіны занадта хутка здымалі абмежаванні, а людзі аслаблялі пільнасць.

«Па меры распаўсюджвання вакцын жыццёва важна, каб усе мы працягвалі прытрымлівацца мер засцярогі, што дапаможа абараніць сябе і адно аднаго», — падкрэсліў дырэктар СААЗ.

Раней у студзені дырэктар праграмы СААЗ па надзвычайных сітуацыях у галіне аховы здароўя Майкл Раян заявіў, што цалкам перамагчы каранавірус будзе вельмі складана.

Ён адзначыў, што пакуль чалавецтву ўдалося выкараніць толькі воспу, а такія хваробы, як поліяміэліт і адзёр, перамагчы не ўдалося. Тое ж самае можа адбыцца з COVID-19 — ён стане эндэмічнай хваробай.

Раян таксама паведаміў, што перамагчы каранавірус будзе цяжка з-за нераўнамернага распаўсюджвання вакцыны супраць яго паміж краінамі. І пашырэнне захворвання працягнецца, калі вакцынацыя не будзе ісці паўсюдна.

28 студзеня СААЗ пацвердзіла, што колькасць хворых на COVID-19 ва ўсім свеце перавысіла адзнаку ў 100 млн чалавек. Найбольшая колькасць выпадкаў каранавіруснай інфекцыі зарэгістравaная ў ЗША, Індыі, Бразіліі, Расіі і Вялікабрытаніі.

Скажыце, доктар...

# НАВОШТА НАМ АБСЛЕДАВАЦЦА?

## Якія віды раку выяўляе скрынінг

**У Беларусі плануецца ўвядзенне яшчэ дзвюх праграм скрынінгу раку — страўніка і лёгкага. Навуковыя даследаванні па праграме раку страўніка завершаны, і пасля зніжэння захваральнасці на COVID-19 яна будзе больш шырока выкарыстоўвацца ў нашай краіне. Навуковыя даследаванні па скрынінгу раку лёгкага пакуль яшчэ працягваюцца, але калі яны пакажуць сваю эфектыўнасць, праграму будуць прымяняць для курыльшчыкаў «са стажам». Нагадаем, што ў нашай краіне выконваюцца скрынінгавыя абследаванні (абследаванні людзей, якія не маюць скаргаў і лічаць сябе здаровымі) на рак малочнай залозы, прастаты, шыйкі маткі і каларэктальны рак. Калі планавая дапамога ў краіне будзе аднаўлена, гэтыя праграмы зноў пачнуць дзейнічаць.**
**Хто ў групах рызыкі па самых распаўсюджаных у нас лакалізацыях раку? Як яго выявіць на ранняй стадыі? Напярэдадні Сусветнага дня барацьбы з ракавымі захворваннямі, які будзе 4 лютага, пра скрынінгавыя праграмы і іх вынікі мы паразмаўлялі з намеснікам дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам, членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Сяргеем КРАСНЫМ.**



— Дзякуючы праграмам скрынінгу частата выяўлення нулявой і першай стадыі раку павялічылася ў 2-6 разоў. Мы параўноўвалі сярэднія лічбы ў папуляцыі пры звычайным стане спраў з вынікамі пілотнага праекту скрынінгу ў тым ці іншым раёне. У цяперашні час вельмі праблематычнае пашырэнне гэтых праграм, бо ў сувязі з COVID-19 лячэбная сетка працуе з перагрузкай. Вясной, калі чакаецца зніжэнне захваральнасці на каранавірусную інфекцыю, яны адновяцца. Было закуплена шмат дыягнастычнага абсталявання пад COVID-19, і яно можа выкарыстоўвацца для скрынінгу раку лёгкага (камп'ютарныя тамографы) і ПЛР-дыягностыкі раку шыйкі маткі. Мы будзем актыўна гэта выкарыстоўваць і, мяркую, атрымаем добрыя вынікі.

***— Нашы анколагі распрацоўваюць і праводзяць навуковыя выпрабаванні ўласных скрынінгавых праграм. Чаму нам не падыходзяць праграмы іншых краін?***

— Часам сапраўды ўзнікае жаданне ўзяць чужую скрынінгавую праграму і прымяніць, але так не атрымліваецца. У розных краінах людзі моцна адрозніваюцца, таксама розняцца і сістэмы аховы здароўя. Падчас навуковага даследавання скрынінгавай праграмы вывучаецца не толькі яе эфектыўнасць, але і выканальнасць — ці можна яе прымяніць да ўсёй папуляцыі. Таксама важны кошт — ці па сілах ён нашаму бюджэту, бо цана некаторых даследаванняў дастаткова высокая, напрыклад той жа камп'ютарнай тамаграфіі. І калі мы паспрабуем уцягнуць усё насельніцтва, мы проста не пацягнем, і ў гэтым няма вялікага сэнсу. Таму і выбіраюцца групы рызыкі.

Акрамя таго, розныя пухліны развіваюцца ў людзей у розных частках свету зусім па-рознаму. Рак страўніка ў Японіі ці Паўднёвай Карэі і ў ЗША адрозніваецца карэнным чынам. І яго скрынінг у Японіі аказаўся эфектыўны, а ў ЗША — цалкам наадварот. А Беларусь дзесьці пасярэдзіне. Таму мы спачатку павінны правесці пілотны праект — менавіта каб паглядзець вынік, — і толькі пасля гэтага рэкамендаваць пашырэнне праграмы на рэгіёны. І гэта павінна рабіцца паступова, звычайна працэс яе распаўсюджвання на ўсю краіну расцягваецца на 10-15 гадоў.

***— Апошняй укаранялася скрынінгавая праграма па каларэктальным раку. Якія яе вынікі? Ці ахвотна пацыенты пагаджаюцца праходзіць каланаскапію?***

— Мы сапраўды перажывалі, што людзі будуць адмаўляцца. Як паказала практыка, аказалася наадварот. Удзельнікі дзяліліся адзін з адным інфармацыяй, і нават сфарміравалася пэўная чарга на даследаванне. І быў атрыманы унікальны вынік. Частата выяўлення раку тоўстай кішкі ў групе скрынінгу аказалася ў шэсць разоў большая, чым у сярэднім у папуляцыі. Папросту кажучы, на аднаго выяўленага пацыента ў звычайных умовах, а гэта, як правіла, здарaецца, калі ўжо з'яўляюцца слабасць, крывацёк, кішэчная непраходнасць, а значыць, захворванне запушчана, ёсць яшчэ пяць бессімптомных. І яны не будуць выяўлены, пакуль не з'явяцца сімптомы. Такі чалавек, умоўна кажучы, ходзіць са злаякаснай пухлінай, пакуль яна з нулявой ці першай стадыі не пяройдзе ў трэцюю-чацвёртую.

Другі вынік — прыкладна 80 % пухлін выяўлялася ў нулявой і першай стадыі і вылечвалася эндаскапічнымі метадамі. У 20 % выпадкаў была трэцяя ці чацвёртая стадыя, прыходзілася рабіць вялікія аперацыі. Насамрэч па краіне гэтая лічба нашмат больш сціплая: прыкладна каля 40 % выпадкаў каларэктальнага раку выяўляецца ў 1-2-й стадыях. Пра нулявую стадыю ўвогуле казаць не выпадае — гэта рэдкасць і выпадковае выяўленне.

Але скрынінг раку тоўстай кішкі — гэта яшчэ і прафілактыка. Асноўная яго задача — выяўленне не раку, а паліпаў, з якіх у будучым можа вырасці злаякасная пухліна. І паліпы былі выяўлены ў кожнага другога. Але не ўсе паліпы небяспечныя: толькі ў 9 % пацыентаў, якім зрабілі каланаскапію, былі выяўлены паліпы, з якіх патэнцыяльна магла б вырасці злаякасная пухліна. Інакш кажучы, у кожнага 11-га, каму зрабілі каланаскапію, было папярэджана развіццё раку тоўстай кішкі. Гэта ўнікальны вынік. Мы выдалілі паліп, і чалавек можа спакойна жыць, праз пяць гадоў яму варта паўтарыць гэтае абследаванне і выдаліць паліпы, калі яны ўзніклі зноў.

Была зроблена высновa, што праграма эфектыўная для нас. Трэба выканаць 200 каланаскапій, каб выявіць адзін выпадак раку, і 11, каб папярэдзіць адзін выпадак раку. Гэта невялікія лічбы для нашай краіны, таму прынята рашэнне распаўсюджваць гэту праграму на рэгіёны. Апошняе будзе рабіцца паступова, бо патрабуюцца абсталяванне, спецыялісты, спецыяльныя ўмовы.

***— Хто ў групе рызыкі па каларэктальным раку?***

— Падчас навуковых даследаванняў у скрынінгавай праграме былі людзі ад 45 да 70 гадоў. Аказалася, што ва ўзросце ад 45 да 50 гадоў мы не выявілі ні аднаго выпадку раку. Але частата выяўлення небяспечных паліпаў у іх была такая ж, як і ў старэйшым узросце. Інакш кажучы, праз 10—15 гадоў у іх з'явіліся б злаякасныя пухліны. Таму, канешне, пачынаць скрынінг рэкамендуецца з 45 гадоў. На жаль, гэта не атрымаецца адразу, пакуль што ўзрост скрынінгавай групы — ад 50 да 70 гадоў.

***— Хто ўваходзіць у групы рызыкі па раку прастаты і малочнай залозы? Раскажыце, як працавалі гэтыя скрынінгавыя праграмы.***

— У скрынінгавай групе па раку прастаты — мужчыны ад 50 да 65. Іх правяралі на ПСА (прастатычны спецыфічны антыген), гэта спецыфічны анкамаркер, вызначэнне якога праводзіцца ў сываратцы крыві. У старэйшым узросце, калі няма ніякіх скаргаў, няма сэнсу яго рабіць. Бо рак прастаты — гэта пухліна, якая павольна прагрэсуе, патрэбны нават не гады, а дзесяцігоддзі, каб яна прывяла да вялікіх праблем. Адпаведна, калі ўсё было добра да 65 гадоў, пацыент выключаецца з праграмы.

Скрынінг раку прастаты працаваў па ўсёй краіне. У праграму былі ўцягнуты 280 тысяч мужчын, гэта істотная лічба. І адразу быў атрыманы вынік у маштабах краіны — упершыню за ўсю гісторыю назіранняў было адзначана зніжэнне смяротнасці ад раку прастаты. Калі да 2011 года смяротнасць расла па 10 % кожны год, то з 2012 года пачала зніжацца — мінус 2 % штогод. На працягу 2020-га скрынінг быў практычна спынены. Спадзяёмся, што будучым летам ён будзе адноўлены, і так хутка адмоўных наступстваў мы не адчуем. А вось калі і далей будуць праблемы са скрынінгам, сапраўды можам зноў атрымаць рост смяротнасці ад раку прастаты.

Таксама да пандэміі працавала скрынінгавая праграма па раку малочнай залозы. Для жанчын ва ўзроставай групе ад 50 да 70 гадоў праводзілася мамаграфія. У больш маладым узросце гэта даследаванне малаінфарматыўнае і не мае сэнсу. Тут трэба выкарыстоўваць ультрагукавую дыягностыку (УГД). УГД-скрынінг не паказаў такой эфектыўнасці. Некаторыя краіны імкнуліся яго праводзіць, але значных вынікаў не атрымалі. УГД малочных залоз варта рабіць, калі жанчыну нешта непакоіць, ці па ўласнай ініцыятыве, але такой дзяржаўнай праграмы няма. У старэйшым узросце таксама няма сэнсу рабіць мамаграфію, бо калі жанчына рэгулярна праходзіла скрынінг у больш маладым узросце, пасля 70 гадоў рызыка развіцця раку ў яе вельмі нізкая. А нават калі і з'явіцца злаякасная пухліна, яна не паспее прывесці да якіх-небудзь наступстваў да 100-гадовага ўзросту.

Ва ўсёй краіне ў нас закуплена дастатковая колькасць мамографаў, яны лічбавыя, беларускай вытворчасці, вельмі якасныя па выяве. І гэта добра, што ёсць беларускае абсталяванне, бо забяспечыць медустановы такой колькасцю імпартных апаратаў было б праблематычна. Такія скрынінгавыя праграмы наладжаны, мяркуецца цалкам іх аднавіць пасля заканчэння пандэміі.

# НАСТРОЙ ПАДОРЫЦЬ «ПЭЭФКА»

## Магілёўскія фотамастакі прапануюць далучыцца да традыцыі абменьвацца навагоднімі PF-паштоўкамі

**Пейзажы, партрэты, нацюрморты — чаго толькі няма на гэтых фота! Прабачце, не проста на фота — на віншаваннях. Бо на ўсіх іх абавязкова стаяць дзве маленькія літары PF. У перакладзе з французскай гэтая абрэвіятура азначае «Каб павіншаваць» (Pour Felicitier), а на італьянскай гучыць яшчэ больш мілагучна — Po Felicita — «На шчасце». У магілёўскіх фотамайстроў ёсць шматгадовая традыцыя ў студзеньскія дні збірацца разам у народным фотаклубе «Вясёлка» і рабіць свята ў стылі PF — абменьвацца аўтарскімі паштоўкамі і выбраць з іх найлепшую. Гэты год не стаў выключэннем.**



Фотамастак FIAP Зіновій ШЭГЕЛЬМАН дасылаў кранальныя «пэзфкі» нават з Ізраіля.

— Традыцыя рабіць PF-паштоўкі ў народным фотаклубе «Вясёлка» існуе з пачатку 1980 гадоў, — расказвае адна з арганізатараў конкурсу, **магілёўскі фотамайстар і ўладальніца багатай калекцыі «пэзфак» Ірына САВОСІНА.** — Фота абавязкова павінна быць памерам 9 на 12 або 10 на 15 сантыметраў з пазначаным на ім надыходзячым годам і значком PF. Мы прачыталі пра гэтае мастацтва ў чэшскім часопісе «Рэвю-фатаграфія». Цяпер я нават і не ўспомню, хто нам яго прынёс. З яго мы даведаліся і пра тое, што «пэзфкі» ўжо рабілі ў СССР. І адразу ж вырашылі паспрабаваць. Выбіралі, каб і сюжэт быў цікавы, і якасць, і нейкія дэталі. Усё павінна было быць элегантна. У маёй калекцыі якраз захавалася некалькі такіх віншаванак таго перыяду ад маіх настаўнікаў Зіновія Шэгельмана і Паўла Цішкоўскага. Самая ранняя — 1983 года — ад нашага калегі Аляксандра Гаражанцава, які цяпер жыве ў Санкт-Пецярбургу. Быў год



«Пэзфка» вядомага беларускага фотамастака з Мінска Віктара БУТРЫ, знятая на плёнку і надрукаваная ўручную пад фотапавелічальнікам.




Той самы здымак са Святым возерам Ганса ШТОЛЬЦА з колішняй ГДР.

Свінні, і на яго «пэзфцы» вясёлы лычык выглядвае праз шчыліну ў агароджы. Зроблена ў духу ўсходніх календароў, якія тады якраз увайшлі ў моду.

Першую «пэзфку» Ірына зрабіла ў таксама модным у 1980-я стылі «ню». Асабліва складана было зрабіць подпіс, і фотамастак Мірон Шчудло, з якім яна працавала ў той час на «Магілёўхімвалакне», вывеў ёй каліграфічным почыркам на гатовым здымку запаветныя літары — PF. Арыгінал быў памерам 24 на 30 сантыметраў, з яго Ірына потым зрабіла мініяцюру ў форме паштоўкі.




Найлепшая «пэзфка» — 2021 ад Анатоля МЕЛЬНІКАВА.

Улічваючы, што пра лічбавыя апараты тады нават яшчэ і не марылі, а праяўляць плёнку і рабіць усё астатняе прыходзілася ўручную, работа сапраўды атрымлівалася штучная. Гэта сёння «Фотапшоп» у дапамогу кожнаму, паставіць значок PF ды і любы іншы — не праблема, а ў 1980-я было хоць гвалт крычы. Не дзіўна, што Ірына вярнулася да гэтай традыцыі толькі пасля 15-гадовага перапынку. Хоць некаторыя яе калегі працягвалі рабіць «пэзфкі», у яшчэ аднаго магілёўскага фотамайстра Аляксандра Ліціна, напрыклад, ёсць здымкі пачатку «нулявых».

Дарэчы, традыцыя PF-віншаванняў нарадзілася не на пустым месцы, ёй спадарожнічала далёкая гісторыя. «Прабацькамі» сучасных «пэзфак» былі паштоўкі ў стылі «адкрыты ліст». У пачатку XX стагоддзя можна было заказаць у фотаатэлье фотапаштоўку са сваім партрэтам. Яна друкавалася на спецыяльнай паперы, на адвароным баку яе можна было напісаць тэкст, прыклеіць марку і адправіць роднаму чалавеку па пошце. А вось значок PF з'явіўся, па некаторых даных, у канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Фотааматары друкавалі свае шэдэўры ўручную пад фотапавелічальнікам і праяўлялі ў спецыяльных кюветах — фотаванначках.

— Тыраж «пэзфак» заўсёды быў абмежаваны — 10—20 штук, больш ніхто ніколі не друкаваў, — кажа Ірына Савосіна. — Навошта? Ды і дорага. Сёння фатаграфічная мініяцюра стала прадметам абмену і калекцыянавання.



«Пэзфка» канца 80-х Ірыны САВОСІНАЙ, якую яна зрабіла са свайго здымка для міжнароднага фотасалона гумару ў балгарскім горадзе Габрава.

І папоўніць калекцыю пакуль магчыма толькі адзіным спосабам: абмяняць неабходны экземпляр на Новы год на ўласны твор!

Магілёўскія фатографы з задавальненнем абменьваюцца «пэзфкамі» і са сваімі калегамі са сталічнага фотаклуба «Мінск», дзе гэта традыцыя таксама вельмі развітая. Там многія аўтары дасюль аддаюць перавагу чорна-белай плёнцы і ручной класічнай апрацоўцы. Без усялякай «лічбы».

— Мне падабаецца, што «пэзфка» — гэта мініяцюра, аўтарская работа, — кажа Ірына. — А аўтар заўсёды стараецца паказаць свае найлепшыя рэчы, адлюстраваць уласны стыль. Сёння можна любую «штучку» смачна падаць. Мне асабіста важнае афармленне значка, прозвішча, агульны выгляд — ёсць вельмі арыгінальныя ідэі. Хоць некаторыя фота ўжо самі па сабе цікавыя і самадастатковыя, і вельмі прывабна выглядаюць у маленькім фармаце. З часам можна сабраць шыкоўную калекцыю добрых фота ад розных аўтараў.

У альбоме Ірыны Савосінай 400 «пэзфак», сярод якіх можна сустрэць вельмі незвычайныя. Ёсць, напрыклад, фотапаштоўкі ад немцаў, якія ў 1980-х прыязджалі працаваць на «Магілёўхімвалакно» і здымалі Магілёў. Яны, дарэчы, былі членамі нямецкага фотаклуба ў горадзе Вільгельм-Пік-Штадт-Губен.

— На іх наш Магілёў не пазнаць, — заўважае Ірына. — На здымку Святое возера, але знятае з таго берага, адкуль мы ніколі яго не здымалі. На пярэднім плане




PF-«прышчэпка» ад аўтара.

старая лодка і подпіс ад Ганса Штольца: каб карабель быў зноў на плаву. У іх было прынята ўкладваць пэўную філасофію ў свае паштоўкі. Яго калега зняў дарогу, паказальнік і падпісаў: знайсці правільны шлях.

Апошнім часам «пэзфка» трапіла ў разрад элітарнага віду мастацтва, якое існуе ў асноўным сярод фотамастакоў. Сёння зрабіць фота не праблема, трэба яшчэ чымсьці зачапіць. У пачатку кожнага года ў Магілёве вось ужо пяць сезонаў праводзіцца конкурс на найлепшую «пэзфку». Летась у Магілёўскім музеі этнаграфіі Ірына Савосіна арганізавала выстаўку найбольш цікавых работ з калекцый магілёўскіх фотамайстроў Аляксандра Ліціна, Анатоля Талкачова, Андрэя Місючыка і іншых. Рэзананс быў моцны. Многія пажадалі прычыніцца да гэтага віду мастацтва.

Актыўным захавальнікам традыцыі з'яўляецца кіраўнік народнага фотаклуба «Вясёлка» Анатоль Талкачоў, ён адказны за клубную калекцыю. Ірына дапамагае яму апрацоўваць тыя работы, якія прыходзяць на конкурс па пошце. А сёлета наогул шмат хто прыслаў «пэзфкі» ў электронным выглядзе, вырашыўшы паўдзельнічаць дыстанцыйна. Пандэмія як-ніяк. Але на творчасці гэта не вельмі адбіваецца. Тым больш што зіма нарэшце парадавала нас прыгожымі марознымі дзянёчкамі, ёсць з чаго натхніцца. Цікава, што ніводны не прысвяціў сваё фота гаспадару года — Быку. Найбольш актыўна ўпрыгожвалі сімваламі свае «пэзфкі» ў гады Свінні, Пеўня, Сабакі, Зайца, Каня і нават Авечкі. Цяпер гэта не так папулярна. Больш сталі рабіць пейзажных здымкаў, філасофскіх, рэпартажных, канцэптуальных...

— Фотаздымкаў сёння ў кожнага шмат, трэба яшчэ ўмець выбраць найлепшы, — кажа Ірына. — Для гэтага не пашкодзіць ведаць, што такое кампазіцыя і святло, што такое добра і дрэнна, мець свой індывідуальны почырк. Калі асвятленне працуе і «пэзфкі» выглядаюць цікава, адчуваецца рука аўтара. Нас заўсёды вучылі думаць над будучым шэдэўрам цэлы год. Я да конкурсу пачынаю рыхтавацца ўжо восенню. У апошні момант такія справы не робяцца. Якая будзе пара года на здымку, не вельмі важна. Сюжэты PF могуць быць самыя разнастайныя. Сэнс такіх карцін часцей за ўсё сімвалічны, бо Новы год — гэта мяжа, этап, пераход ад чагосьці старога да нечага новага. Таму ўпадабаныя тэмы — скрыжаванні, павароты, дарога да гарызонту, усход або захад сонца, як мяжа адыходзячага і таго, што прыходзіць, святло ў цемры, адкрытае акно або дзверы. Але колькасць падобных сімвалаў абмежаваная, і, каб не паўтарацца, многія аўтары аддаюць перавагу разнастайным асацыяцыям, камбінацыям прадметаў, мантажу, пераздымцы гістарычных дакументаў або рэпрадукцый з часопісаў. Часта гэта нават спецыяльна зробленыя пастановачныя здымкі, нацюрморты або гульня акцёраў.

Сёлета работы былі ў асноўным ад магілёўскіх аўтараў, але некаторыя прыляцелі на конкурс з Мінска і нават Масквы. А «пэзфкамі» года — найлепшымі падчас галасавання — сталі гэтым разам работы вядомых магілёўскіх фотамайстроў Анатоля Мельнікава, Аляксандра Ліціна і Анатоля Талкачова. Калекцыя клуба папоўнілася новымі цікавымі здымкамі, а кожны з аўтараў захаваў нешта цікавае асабіста для сябе. З гадамі гэтыя пакуль што звычайныя, на першы погляд, «пэзфкі» набудуць значнасць і перададуць нашчадкам дух цяперашняй нашай сучаснасці. Дарэчы, фотааматарам з боку таксама не забараняецца браць удзел у конкурсе «пэзфак». Я вось таксама рызыкнула. Асаблівай філасофіі ў маіх здымках пакуль няма, але прафесіяналам спадабалася мая прышчэпка на фоне зімовага пейзажу. Ірына дапамагала мне аформіць шэдэўр у выглядзе «пэзфкі». Так што я ўжо трапіла ў гісторыю. Далучайцеся на наступны год!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Ірыны САВОСІНАЙ.**

Ганна ЛЮБЯНКОВА:

# «СПОРТ — МАЯ ПАНАЦЭЯ»

## Яна працуе дзеля алімпійскіх кольцаў над біятлонным стадыёнам



**Кожная серада — дзень біятлона на тэлеканале «Беларусь 5». Аўтар і вядучая праекта «Агнявы рубеж» Ганна Любянкова зараджае гледачоў любоўю да згаданага віду спорту. Але гэта не адзіная тэлевізійная роля журналісткі. У першую чаргу Ганна — спартыўны каментатар. Яе голас знаёміў гледачоў з трансляцыямі спаборніцтваў па 19 відах спорту, сярод якіх танкавы біятлон і верталётныя гонкі. Яе слухаў мінскі стадыён «Дынама» падчас легкаатлетычнага матча Еўропа—ЗША ў 2019 годзе. Яна — актыўны ўдзельнік Мінскага паўмарафону і многіх спартыўных мерапрыемстваў. Ганна расказала «Звяздзе», якое яно, жыццё па-за тэлеэкранам, і як спраўляцца з немагчымым.**

***— Ганна, як ты ставішся да размоў аб тым, што ў час інтэрнэту тэлебачанне ўжо не мае такой папулярнасці і важнасці, як раней?***

— Безумоўна, за інтэрнэтам будучыня. Але і тэлебачанне не стаіць на месцы, мы пастаянна ствараем новыя праекты, абнаўляем графіку — на шчасце, цяпер шмат тэхнічных магчымасцяў. У нас ёсць новы канал «Беларусь 5. Інтэрнэт», і мы развіваемся і там. Напрыклад, усе выпускі маёй праграмы выкладваюцца на YouTube, і робіцца гэта аператыўна. Тэлебачанне было, ёсць і будзе, бо мноства людзей бярэ інфармацыю адтуль. Так, моладзь аддае перавагу інтэрнэту, але мы стараемся зачапіць і зацікавіць людзей розных пакаленняў, звычак і інтарэсаў.

***— Узнікалі ў цябе калі-небудзь думкі аб стварэнні свайго спартыўнага YouTube-канала?***

— Такія думкі ўзнікаюць не ў мяне, а ў людзей навокал. Вельмі шмат пытанняў, чаму я не сыходжу ў інтэрнэт. Але там прыйдзецца самой вырашаць усе пытанні і ствараць належныя ўмовы. Дзякуючы тэлекампаніі я маю абсталяванне, у мяне ёсць дапамога аператара. Я не выключаю, што некалі буду працаваць у інтэрнэце, але пакуль я бачу сябе толькі на тэлебачанні. У першую чаргу я каментатар. А каментаваць спаборніцтвы можна толькі на тэлеканале. Толькі ён можа атрымаць тэлевізійную карцінку з месца падзей. Я магу адмовіцца ад усяго, але я ніколі не адмоўлюся ад каментатарства.

***— Ты неяк расказвала, што ў дзяцінстве, гледзячы спаборніцтвы, выпісвала ўсе вынікі. Табе хоць аднойчы гэтыя запісы спатрэбіліся?***

— Я не толькі запісвала вынікі, а яшчэ і замалёўвала сцягі. Памятаю, калі пачалі перамагаць нарвежцы, у мяне была праблема, як намаляваць нарвежскі сцяг, ён жа такі складаны. Я ўсё запісвала таму, што ў мяне не было інтэрнэту і трэба было недзе захоўваць інфармацыю. Спачатку я карысталася запісамі. А цяпер уся інфармацыя ёсць у адкрытым доступе, і ў той жа сістэме Міжнароднага саюза біятланістаў можна за некалькі секунд усё знайсці. Усе свае сшыткі я захоўваю і ніколі не выкіну, як бы мама таго ні хацела. Для мяне гэта быў выдатны вопыт — я запамінала, аналізавала, рабіла высновы. І гэта была цудоўная крыніца інфармацыі. А сёння дастаткова ведаць, на якія сайты заходзіць і на якія акаўнты ў сацыяльных сетках падпісвацца. Хоць я па-старому штосьці пішу ад рукі, так лепш запамінаю і ведаю, дзе знаходзіцца патрэбная мне інфармацыя.

***— Мара дзяцінства аб знаёмстве з кумірамі спраўдзілася дзякуючы рабоце?***

— У дзяцінстве я не магла ўявіць, што некалі пазнаёмлюся з Уле-Эйнарам Бьёрндаленам. Мне не тое што пазнаёміцца, мне было дастаткова ўбачыць яго ўжывую. А аб тым, каб выпіць з ім кавы ці выйсці на адзін подыум на паказе калекцыі Дар'і Домрачавай, і гаворкі ісці не магло. У майго таты ёсць маё першае фота з Б'ёрндаленам — я там так усміхаюся, што, здаецца, у мяне зубоў больш, чым у акулы! З часам мае дзіцячыя мары трансфармаваліся, я магу спакойна размаўляць з усімі кумірамі дзяцінства, але гэта ўжо не выклікае вялікага хвалявання. Дзякуючы рабоце я бачыла Аляксандра Авечкіна, Ліанэля Мэсі і ўсіх з «Барселоны», маёй любімай футбольнай каманды. З пакуль нерэалізаваных мар — знаёмства з Майклам Фэлпсам, таму што я сама займалася плаваннем.

***— Па тваіх словах, ты не пайшла вучыцца на факультэт журналістыкі, каб не ставіць творчасць на паток. Але ж журналістыка ў пэўнай ступені — творчасць на патоку. Ці не?***

— Творчасць на патоку ў мяне ў «Агнявым рубяжы». Але я не пазіцыяную сябе як аўтара, вядучую праекта ці ўвогуле як яго кіраўніка. Перш за ўсё я каментатар, і ў гэтай дзейнасці немагчыма паставіць творчасць на паток, там пастаянна штосьці новае. У мяне часта пытаюцца: «Як ты так хутка гаворыш, ты чытаеш ці яно само ў галаве нараджаецца?» А яно сапраўды нараджаецца, само прыходзіць. У кожнага з каманды тэлеканала ёсць свае віды спорту, і кожны працуе з тым, што ведае і ў чым разбіраецца. У мяне гэта біятлон, хакей, плаванне, лёгкая атлетыка, веславанне, стральба з лука і «Дакар». А падчас вучобы на журфаку прыйшлося б працаваць з рознымі тэмамі, якія мне нецікавыя, а я хацела працаваць толькі са спортам. Я атрымала добрую адукацыю ва ўніверсітэце культуры і пайшла па сваім шляху.

***— Раскажы, калі ласка, пра самы вялікі форс-мажор, з якім прыйшлося сутыкнуцца падчас прамога эфіру.***

— Самы вялікі форс-мажор — гэта чорнае поле, калі знікае карцінка, з астатнім можна разабрацца. Памятаю, мы працавалі на Формуле Е. Каментатарскія кабінкі былі на трэцім паверсе, а тэхнічнае суправаджэнне, рэжысёр, гукарэжысёр былі на паверх вышэй, яны мяне, зразумела, на бачылі. Мой калега ў суседняй каментатарскай уключыў святло ці кандыцыянер і ва ўсіх трох каментатарскіх знікла электрычнасць. Наверсе ўсё добра, рэжысёр не разумее, чаму я маўчу, а ў мяне нічога не працуе. Я панікавала секунд дзесяць, а потым пазваніла, сказала, што ў мяне праблемы. Усё вельмі хутка аднавілі, але цішыня ў эфіры была хвіліны дзве. Гонка працягвалася, карцінка ішла, а каментарыя не было. Мне перыядычна сніцца, што я спазняюся на эфір, але такога ніколі не было наяве. Я ніколі не затрымлівалася ў ліфце, едучы на эфір, бо каментатары вельмі рэдка карыстаюцца ліфтам.

***— А свой самы ўдалы эфір успомніш?***

— Найлепшыя эфіры я правяла на Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. А найбольш выдатны па эмацыянальным напаўненні быў «сярэбраны» эфір Дар'і Домрачавай у мас-старце. Добры быў эфір, калі нашы біятланісткі выйгралі эстафету. Алімпійскія эфіры з месца падзей нічога не перавысіць. І справа не толькі ў самім эфірах, а ва ўсім, што навокал. Ніколі не забуду, як пасля перамогі нашых дзяўчат у эстафеце я, агорнутая нашым сцягам, уся ў слязах, ляцела праз трыбуну ў мікс-зону (зона на стадыёне для зносін журналістаў са спартсменамі. — **«Зв.»**), і мяне ўсе абдымалі і віншавалі. Гэта запомніла, а самі эфіры — не, прайшлі як у тумане. Цяпер у мяне ёсць мара папрацаваць на летніх Алімпійскіх гульнях, я сама ў мінулым плыўчыха, і, канешне, мне хочацца каменціраваць алімпійскае плаванне. У дзяцінстве я займалася плаваннем і марыла аб тым, што некалі буду выступаць на Алімпійскіх гульнях. Пэўным чынам гэта мара трансфармавалася, і калі яна ўвасобіцца, я зраблю сабе татуіроўку ў выглядзе алімпійскіх кольцаў як сімвал пройдзенага рубяжа.

***— Будзем шчырыя, кожны спартыўны журналіст, як і кожны спартсмен, працуе дзеля Алімпійскіх гульняў. Што адчувала падчас сваёй першай Алімпіяды?***

— Разуменне, што я на Алімпіядзе, прыйшло толькі ў Пхёнчхане. Я не верыла, што ўсё гэта адбываецца на самай справе. Тым больш я выпадкова даведалася, што еду на Алімпійскія гульні. Мяне не дабавілі ў чат у "Вайберы", а папярэдзіць забылі. Ніколі не забуду, як я ўпершыню ўвайшла ў сваю каментатарскую, падчас праверкі рабочых месцаў, і ўбачыла алімпійскія кольцы над біятлонным стадыёнам. Гэта быў момант, да якога я ішла ўсё жыццё, дзеля чаго я працавала. Хтосьці з нашых калег працуе дзеля грошай, хтосьці — дзеля прэстыжу, а я — дзеля мары. Я адразу ўспомніла кастынг на Белтэлерадыёкампаніі ў 2013 годзе і зразумела, што недарэмна туды пайшла.




***— Хто твой «каментатарскі трэнер», на каго ты раўняешся?***

— Я заўсёды раўнялася на Уладзіміра Мікалаевіча Навіцкага, на яго нельга не раўняцца. Мне вельмі дапамог Саша Дзмітрыеў. Ён навучыў мяне рыхтавацца так, каб 70 працэнтаў загадзя падрыхтаванай інфармацыі не ўваходзіла ў эфір. І не таму, што я забылася, а таму, што часу не хапіла. Люблю слухаць эфіры Дзяніса Казанскага з «Матч-ТВ», Пашы Занозіна. Мне падабаецца работа Паўла Баранава, здаецца, ён можа каментаваць любы від спорту. Дзіма Герчыкаў захапляе сваёй эрудыцыяй. Ён вельмі гарманічна пераключаецца са спартыўнай часткі на іншыя тэмы, накшталт гісторыі стадыёна ці цікавых фактаў пра горад, дзе праходзіць турнір. Канешне, я гляджу эфіры Дзімы Губерніева. Мы з ім падобныя па сваёй эмацыянальнасці, мне імпануе яго свабодная падача. Хоць такіх эмоцый я сабе ў эфіры не дазваляю, не скачу, не б'ю рукамі па стале, толькі ламаю сашчэпкі і некалькі разоў кідала ручку. Мне падабаецца, як упэўнена Дзіма адчувае сябе ў эфіры. Гэта заўжды захапляе гледача.

***— На тэлеканале «Беларусь 5» існуе практыка, калі разам з каментатарам у эфіры прысутнічае спецыяліст з віду спорту, па якім праводзіцца турнір. Як табе такі падыход да работы?***

— Мы ўвялі такую практыку пасля Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа. Спецыялісты расказваюць такія тонкасці, якія каментатары проста не ведаюць — і гэта крута і цікава, але чалавеку трэба ўмець размаўляць і паводзіць сябе ў эфіры. Ёсць цікавыя, камунікабельныя людзі, але побач з экранамі, гарнітурай яны заціскаюцца, баяцца памыліцца, і ад гэтага пакутуе якасць. У нас шмат дзейных спартсменаў, з якіх маглі б атрымацца выдатныя каментатары. Але гэта пакуль немагчыма, бо людзі не могуць каментаваць спаборніцтвы, на якіх самі ж выступаюць. У ідэале каментатарамі пэўнага віду спорту павінны быць яго прадстаўнікі.

***— Ганна, як пры такім насычаным графіку ты знаходзіш час на асабістае жыццё, на сябе?***

— Я заўсёды стараюся знайсці час для сябе. У мяне традыцыя — кожны тыдзень я езджу ў лазню. Я не адпачываю седзячы дома, не гляджу серыялы. Наконт асабістага... Даўно стала зразумела, што побач са мной будзе толькі той чалавек, які зможа прыняць мой парадак жыцця. Спачатку было складана, бо людзям цяжка зразумець, як можна працаваць цэлыя выхадныя, а для мяне гэта норма. Прыходзіцца шукаць кампрамісы, дамаўляцца. Вельмі аблягчае жыццё аўтамабіль, значна эканоміць час. Я жыву ў фармаце дом—работа—трэніроўка—госці—дом і атрымліваю ад гэтага задавальненне. Ёсць жаданне — ёсць магчымасць усё паспець. Хоць, канешне, прыходзіцца ахвяраваць сном. Я майстар спорту міжнароднага класа па недасыпанні, раблю гэта вельмі прафесійна.

***— Табе знаёма адчуванне эмацыянальнага выгарання?***

— Былі такія моманты, але яны нядоўга працягваліся. Мне дапамагае фізічная нагрузка. Я магу ў 10 гадзін вечара паехаць на трэніроўку. Я вельмі люблю бегаць, удзельнічаю ва ўсіх бегавых мерапрыемствах. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў свой час я не спаборнічала ўдосталь. Спорт — мая панацэя ад усяго. Я нікому нічога не даказваю. Я не працую ў спорце, я ім жыву, і гэта мне прыносіць задавальненне. Кожны дзень я іду на работу, а займацца сваёй любімай справай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

## по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», *опубликованную в газете «Звязда» от 09.12.2020 № 240 (29354)*

**Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг»** информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00; работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 09.12.2020 № 240 (29354) следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 10 (десять) трехкомнатных квартир общей площадью по проекту от 70,6 до 91,4 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1350 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1400 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляются не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с представлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

---

**Обнаружено имущество (зеркала, щиты из фанеры ДСП и т. п.), предположительно находившееся ранее в арендуемом ООО «СтартБизнесАп» помещении по адресу: г. Брест, ул. Советская, 34, ТЦ «Дидас-Персия».**

Если вы являетесь собственником вышеуказанного имущества, либо имеете информацию о его собственнике, просим связаться по следующим контактам:
**тел. +375 17 270-80-00, e-mail: info@tcbank.by** УНП 807000163

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении 18 февраля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| Начальная цена – 874 561,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 87 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ №527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **18 февраля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.02.2021 по 16.02.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

| Наименование | Об. площадь, кв. м | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Производственный корпус** | 1130,5 | 500/С-49698 | 16 |
| **Диспетчерская** | 54,7 | 500/С-53818 | 16/12 |
| **Здание специализированное иного назначения (литейный цех)** | 7664,8 | 500/С-47329 | 16 |
| **Производственный корпус** | 4340,5 | 500/С-53224 | 16/1 |
| **Компрессорная** | 473,6 | 500/С-54017 | 16/15 |
| **Электропечь термическая** | 39,8 | 500/С-54018 | 16/16 |
| **Здание весовой** | 24,3 | 500/С-54019 | 16/17 |
| **Административно-хоз. корпус** | 2323,4 | 500/С-49697 | 16/23 |
| Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпорн. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница | | | |
| **Склад** | 2328,4 | 500/С-53297 | 16/2 |
| **Склады** | 895,5 | 500/С-53808 | 16/8 |
| **Склады, гаражи** | 453,6 | 500/С-53897 | 16/9 |
| **Склады, административные помещения, агрегатные** | 563,7 | 500/С-53846 | 16/10 |
| **Инженерный корпус** | 3348,6 | 500/С-46093 | 16 |
| **Административно-производственный корпус № 4** | 19710,5 | 500/С-53638 | 16/3 |
| **Склад** | 2193,5 | 500/D-708019487 | д.16п.2 |
| **Строительный цех** | 507,9 | 500/С-53845 | 16/11 |
| **Насосная станция автоматического пожаротушения** | 194,4 | 500/С-54016 | 16/14 |
| **Станция очистки сточных вод** | 305,1 | 500/С-54015 | 16/13 |
| **Градирня** | 39,1 | 500/С-55130 | 16/18 |
| **Ливневая канализац. сеть** | 1077,5 м | 500/С-1029279 | 16 |
| **Хозяйственно-питьевая водопров. сеть** | 973,2 м | 500/С-1029266 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализац. сеть** | 764,5 м | 500/С-1029275 | |
| **Тепловая сеть** | 236,7 м | 500/С-1029272 | |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внешн. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телеф. сети (инв. № 12030041), оборудование РП-2 (инв. № 13041207, инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. №№ 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. №№ 13040099, 13040120), пульт распределит. (инв. № 13040780), комплекты ТП (инв. №№ 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. №№ 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых материальных историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 29 815 200,61 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Заводоуправление** | 2763,5 | 500/С-53298 | 16/4 |
| Составные части и принадлежности: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры | | | |
| **Производственный корпус** | 13365,7 | 500/С-45217 | 16/24 |
| **Технологическая котельная** | 200,30 | 500/С-53824 | 16/7 |
| **Тепловая сеть** | 43,8 м | 500/С-1029271 | 16/4 |
| **Ливневая канализац. сеть** | 547,1 м | 500/С-1029280 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 161,3 и 169 м | 500/С-1029273, 500/С-1029277 | |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 68,4 и 295,1 м | 500/С-1029269, 500/С-1029267 | 16 |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), каб. телеф. сети (инв. № 12030035), комплект. ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. №№ 13040294, 13040283, 13040171), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040202), объекты растительности (деревья 13 шт., газоны 2 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения: 1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на зем. участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зоне линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвиж. матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,3730 га); 2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 18 619 054,40 бел. руб.** | | | |

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1), 500/С-53298 (лот № 3) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

В соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения, многоуровневой автостоянки.

На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **17.02.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **15.02.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by** |

---

# Дещенский сельский исполнительный комитет Узденского района Минской области

## 3 марта 2021 года

## по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке, руб. | Примечание |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Деревни Старина, уч. 6А | 0,1500 | 625680202201000310 | 14 500,00 | 1 337,31 + расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению |
| Лот № 2 | Дещенский сельисполком | д. Зелень, ул. Центральная, уч. 6А | 0,2500 | 625683803601000031 | 8 000,00 | 81,00 + расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 3 | Дещенский сельисполком | д. Русаково, ул. Русаковская, уч. 2 | 0,1000 | 625680211501000031 | 5 000,00 | 0 + расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к электроснабжению |
| Лот № 4 | Дещенский сельисполком | д. Рыбаковщина, ул. Рыбаковщинская, уч. 20А | 0,1033 | 625680211701000042 | 5 000,00 | 1 657,08 + расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к газоснабжению, электроснабжению |
| Лот № 5 | Дещенский сельисполком | д. Теплень, ул. Новая, уч. 29 | 0,1500 | 625680213201000222 | 10 000,00 | 1 580,14 + расходы на публикацию | Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **26 февраля 2021 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенный банком документ об оплате задатка;
- копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников. В случае если участник один, аукцион признается несостоявшимся и комиссия имеет право принять решение о продаже единственному участнику аукциона земельного участка в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов (с согласия участника).

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **info@uzda.gov.by, либо по телефонам: (801718) 35135, 35149.**

Каго мы бачым!

# УДАЛА СХАВАЎСЯ

## Знайшлі від хамелеонаў, які лічыўся вымерлым

**На Мадагаскары выявілі хамелеона Furcifer voeltzkowi, які не трапляўся на вочы навукоўцам з 1913 года і лічыўся вымерлым. Пераадкрыць страчаны від атрымалася ў нямецкіх герпетолагаў. У спробе высветліць яго лёс апошнія адправіліся ў аддаленую частку вострава, а жывых Furcifer voeltzkowi знайшлі не ў глухіх лясах, а ў садзе пры атэлі. Вынікі даследавання апублікаваныя ў часопісе Salamandra.**

Герпетолагі рэгулярна выяўляюць на Мадагаскары новыя віды і падвіды хамелеонаў. На жаль, з-за хуткага знішчэння лясоў многія з даўно вядомых і нядаўна адкрытых відаў гэтых рэптылій апынуліся на мяжы вымірання. А некаторыя і зусім лічацца вымерлымі. Адзін з іх — Furcifer voeltzkowi, якога ўпершыню апісалі ў 1893 годзе, а апошні раз сустрэлі ў 1913-м. У сярэдзіне XX стагоддзя Furcifer voeltzkowi пазбавіўся відавога статусу і зноў атрымаў яго толькі ў 2018 годзе. Да гэтага моманту навукоўцы не бачылі жывых асобін віду ўжо больш за сто гадоў і сур'ёзна асцерагаліся, што ён знік. Прыродаахоўная арганізацыя Global Wildlife Conservation нават уключыла гэтага хамелеона ў топ-25 відаў, якіх шукаюць найбольш.

Каманда герпетолагаў на чале з Франкам Глау з Заалагічнай дзяржаўнай калекцыі Мюнхена вырашыла высветліць лёс названага віду. Вясной 2018 года яны адправіліся туды, дзе гэтыя хамелеоны ўпершыню былі знойдзеныя, — у правінцыю Махадзанга на паўночным захадзе Мадагаскара. Вывучыўшы шэсць пунктаў, уключаючы лясы і ўчасткі вакол выхадаў вапняку на паверхню, яны да свайго здзіўлення ўбачылі хамелеона ў вялікім садзе пры гатэлі ў паселішчы Кацепі. Усяго на вочы навукоўцам трапіліся тры самцы і пятнаццаць самак. Акрамя таго, ужо пасля вяртання з экспедыцыі даследчыкі выявілі здымкі Furcifer voeltzkowi, зробленыя яшчэ ў 2015 годзе, на партале iNaturalist.

Навукоўцы не проста пацвердзілі, што Furcifer voeltzkowi ўсё яшчэ існуе, але і ўпершыню апісалі самак гэтага віду. Аказалася, што яны драбнейшыя за самцоў і больш актыўна мяняюць колер: калі самцы падоўгу застаюцца зялёныя, то самкі часам набываюць вельмі яркую кантрасную афарбоўку.

Генетычны аналіз дазволіў разабрацца ў родавых сувязях ізноў знойдзенага хамелеона. Вывучыўшы ўзоры ДНК трох экзэмпляраў, аўтары пацвердзілі, што яго найбліжэйшы сваяк — Furcifer labordi, які жыве ў сухіх лясах на паўднёвым захадзе Мадагаскара. Сяструнскія віды адрозніваюцца памерамі (Furcifer voeltzkowi буйнейшы), дэталямі афарбоўкі і асаблівасцю нараста на носе.

Аўтары мяркуюць, што, падобна да Furcifer labordi, Furcifer voeltzkowi валодае вельмі кароткім жыццёвым цыклам працягласцю менш за год. Маладыя асобіны вылупляюцца з яек з прыходам сезону дажджоў (у кастрычніку-лістападзе), хутка растуць і прыступаюць да размнажэння. Да пачатку сухога сезону ўсе дарослыя хамелеоны паміраюць, пакінуўшы пасля сябе кладкі яек. Калі гэтая ідэя слушная, то лёгка зразумець, чаму Furcifer voeltzkowi так доўга «хаваўся» ад навукоўцаў: дарослых асобін гэтага віду можна сустрэць толькі на працягу некалькіх месяцаў у годзе, калі большасць дарог да месцаў іх пражывання размытыя дажджамі.

Пакуль невядома, як шырока распаўсюджаны Furcifer voeltzkowi. Глау і яго калегі лічаць, што арэал гэтага віду можа распасціраца мінімум на 100 кіламетраў уздоўж узбярэжжа правінцыі Махадзанга. Аднак незразумела, гаворка ідзе аб адзінай папуляцыі або некалькіх ізаляваных. Улічваючы цяжкае становішча з ахowай прыроды на Мадагаскары, аўтары рэкамендуюць прысвоіць пераадкрытаму хамелеону статус віду пад пагрозай знікнення (Endangered).



Здароўе на талерцы

# «ПАЛІВА» ДЛЯ НЕЙРОНАЎ

## Дыетолаг назвала карысныя для мозга і памяці прадукты

**Некаторыя з іх аказваюць дабратворны ўплыў на нервовыя клеткі чалавека і перадачу сігналаў паміж імі. Пра гэта распавяла выканаўчы дырэктар Расійскага нацыянальнага даследчага цэнтра «Здаровае харчаванне» Зінаіда Мядзведзева.**



Паводле яе слоў, тлустая рыба з паўночных мораў — селядзец, скумбрыя, палтус, камбала, кета, нерка — валодае ненасычанымі тлустымі кіслотамі Амега-3, якія арганізм не можа выпрацоўваць самастойна, і, такім чынам, апошнія могуць паступіць толькі з ежай.

«Амега-3 паскарае рэгенерацыю нейронаў і перашкаджае акісленню, разбурэнню клетак, зніжае хранічнае запаленне ў цэнтральнай нервовай сістэме», — цытуе Мядзведзеву сайт kp.ru.

Для ўмацавання памяці спецыяліст параіла ўжываць ільняны алей халоднага адціскання. Для работы мозга таксама карысная мука з цэльнага зерня, якая ўтрымлівае большую колькасць клятчаткі, чым звычайная. Дыетолаг таксама парэкамендавала ўключыць у рацыён яечны жаўток і горкі шакалад.

Свая траекторыя

# УТАЙМАВАЦЬ МАЛАНКУ

## Навукоўцы стварылі здольны кіраваць ёю лазер

**Міжнародная група даследчыкаў зрабіла лазер, які зможа кіраваць маланкай, змяняючы яе траекторыю і прыцягваючы ў патрэбны пункт. Пра гэта паведаміў тэлеканал РЭН ТБ.**



Для стварэння макета навальніцы навукоўцы выкарысталі дзве плоскія паралельныя пласціны, на якіх назапашваецца электрычны зарад. Пры дасягненні апошнім прабойнага значэння маленькая маланка ўзнікала на выпадковым участку адной пласціны і ўдарыла ва ўчастак на другой.

У мадэлі даследчыкі выкарысталі часціцы графену, якія накіроўваліся лазерам. Лазерны прамень нагрэў мікрачасціцы і стварыў канал з высокай праходнасцю, па якім пачаў існі электрычны разрад. Падчас эксперыменту фізікі прымусілі маланку рухацца па дакладнай траекторыі.

На думку спецыялістаў, іх адкрыццё дапаможа кантраляваць шлях электрычнага разраду ў паветры з вялікай дакладнасцю. Навукоўцы мяркуюць, што кантроль над маланкай будзе карысны для кіравання надвор'ем, у прамысловасці або медыцыне.

Нябачная пагроза

# ЗАМЕСТ СВІНЦУ І БЕТОНУ

## Распрацаваны новы матэрыял для засцярогі ад радыяцыі




**Гэта шкельцы, якія ўтрая больш эфектыўныя за існуючыя аналагі, паведамляе часопіс Journal of Materials Research and Technology.**

Спецыялісты Уральскага федэральнага ўніверсітэта імя Б. М. Ельцына правялі даследаванне радыяцыйнай стойкасці шкла перспектыўнага складу, якое паказала яго высокую ступень экраніравання.

Так, масавы каэфіцыент аслаблення, даўжыня вольнага прабегу, пласт дзесяцікратнага аслаблення і іншыя характарыстыкі пераўзыходзяць параметры матэрыялаў, якія традыцыйна выкарыстоўваюць у радыяцыйнай засцярозе, — бетону і свінцу.

«Наш матэрыял аказаўся ўтрая больш эфектыўны пры паглынанні фатоннага выпраменьвання, чым распаўсюджаныя сёння аналагічныя «цяжкія» шкельцы. Адпаведна, выконваючы супастаўную задачу, ён можа быць утрая танчэйшы. Гэта дае цэлы шэраг пераваг, сярод якіх і прыкметная эканомія», — распавяла навуковы супрацоўнік кафедры эксперыментальнай фізікі УрФУ Марыя Пышкіна.

Па словах навукоўцаў, уздзеянне іанізавальнага выпраменьвання з'яўляецца выпадковым працэсам, таму пры распрацоўцы выкарыстоўвалася мадэляванне выпадковых працэсаў метадам Монтэ-Карла, а таксама іншыя метады камп'ютарнага мадэлявання.

Даследаванні ў гэтым кірунку будуць працягнуты.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# «...ЗБЕГЛІ ДВОЕ НА ПРЫРОДУ І НАЗАД — НЕ КЛІЧЦЕ ІХ!»



**Чыстая праўда: адзін мужчына (ды ці толькі адзін?!.) за навагоднім сталом загадаў жаданне, каб яго жонка ўрэшце стала эканомнай, а цешча — паразумнела. І што вы думаеце? Усё збылося: як толькі гадзіннік прабіў 12, жонка прыняла са стала каньяк, задзьмула свечкі і выключыла тэлевізар, а цешча ў гэты ж час завяла размову пра камету Галея... Вось тады мужчына і не вытрымаў: узяў гармонік і выйшаў на вуліцу.**

**Так было ці не так — справа цёмная, і асвятляць яе намераў няма. А вось расказаць, што было далей, на той самай вуліцы, прыйдзецца, бо здагадак у пошце, як заўжды, хоць вазамі вазі.**

Пачнём здалёк: «Колькі ж успамінаў, колькі розных пачуццяў абудзіў апошні конкурсны здымак! — піша **спадар Іван Астроўскі з Мінска.** — Некалі ў нас на Віцебшчыне падчас калядных свят Цярэшку жанілі. З самых паважаных гаспадароў выбіраліся «бацька», «маці» і «сваты», у хлапцоў ды дзяўчат з'яўлялася магчымасць падабраць сабе пару і для пачатку хай жартам, але ж справіць вяселле. Для гэтага пад спеўнае «Цярэшачка, чаху, чаху, а што ў цябе ў мяху, у мяху?..» сваты апытвалі маладых-несямейных і ў адпаведнасці з іх пажаданнямі вялі перамовы з процілеглым полам...

Калі пары ўжо неяк складаліся, хлопцам (а потым і дзяўчатам пад умольнае: «Ой, дзядулька, здайся...») трэба было паказаць свой спрыт — злавіць «нарачоную» альбо «нарачонага». «Старт» быў цікавы: ходзіць тая ж дзяўчына, адну за адной выдае прыпевачкі, а як толькі збілася ці запнулася, — усё: бяжы і ведай, што табе могуць даць падножку, затрымаць, затуліць у абдымкі... А ўрэшце, як і належыць, «бацькі бласлаўляць» ды распачнуць застолле.

Неслі на яго — хто што мог. І выпівалі — не без таго, — згадвае шаноўны чытач, — але ж галоўнае — спявалі, танцавалі аж да раніцы!

А па вёсцы ў гэты час хадзілі «чэрці»: каму дровы раскідвалі, каму вароты здымалі, каму на страху зацягвалі сані (гурбы вышэй вокнаў былі) ці кавалкам шкла закрывалі комін... Потым расказаў ды рогату было — аж да наступных Каляд!..»

Што іншымі словамі, але тым жа аўтарам апісана так:

*Не ўспомніць без усмешкі*
*Як жанілі ў нас Цярэшку:*
*Уключаліся ў гулі —*
*Ад малых і да бабуляў:*
*Тады шмат было двароў,*
*А на іх — гаспадароў!*
*...Сёння — сум*
*і цішыня:*
*Ні кароў там, ні каня —*
*Люд «тусуецца» абапал*
*Тэлевізара з канапай.*

«Абапал» гумнаў ды хлявоў, трэба разумець, ужо «адтусаваліся» — хапіла ў свой час. Трэба ж і адпачыць — дай бог, па-людску, але... Не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяваецца. Вось і гераіня здымка (паводле **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**) сведчыць:

*Шмат што ў вёсцы зачынілі:*
*Не хаджу на пошту я,*
*І «загклубам» скарацілі,*
*Бо — аптымізацыя...*
*Ды гармонік як пачую,*
*Мне на месцы*
*не ўстаяць!*
*За ваколіцу гляджу я —*
*Кавалераў не відаць...*

Хіба адзін з іх застаўся (на думку **спадара Мікалая Старых з Гомеля**) — музыкант:

*Вельмі любіць цётка Волька*
*Пад гармонік выдаць польку.*
*Няма хлопцаў ні пагудкі, —*
*Выпускае Жульку з будкі:*
*Можна з ёй і танцаваць,*
*І дыстанцыю трымаць.*

Што, вядома ж, важна ў рамках барацьбы з паўзучай заразай... Асабліва — на думку **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска** — калі расслабіўся і не ўцёк, прычым — загадзя, як вось гэтыя двое:

*Ад мікробаў і хваробаў,*
*Ад мітрэнгаў гарадскіх*
*Збегла пара на прыроду*
*І назад — не клічце іх...*
*Будуць тупаць каля хаты,*
*Зрэдку —*
*граць ды танцаваць*
*І навошта ім дэбаты:*
*З-за кагосьці сэрцы рваць?!*

«На прыроду», трэба сказаць, уцякаюць не толькі ад «мікробаў-хваробаў-мітрэнгаў». З'язджаюць (паводле **спадарыні Чыгрынавай**) ад сямейных «разборак», ад зяцёў ды нявестак:

*Цётка яўна не з вясковых,*
*З пасяленак, мусіць, новых?*
*Каб зяцьку не замінаць,*
*Хатку мусіла прыдбаць.*
*Ад'язджала*
*без агляркі...*
*Даглядала летам градкі,*
*А зімой — палёгка ручкам —*
*Вальс-бастон вучыла з Жучкам.*

Ну чаму б і не, калі сабакі і сапраўды чуюць у дзесяць разоў лепей за людзей, могуць распазнаваць чалавечыя эмоцыі, разам з намі перажываць...

Гэта, што называецца, навукай засведчана, а ўжо відавочцамі...

У піўной, кажуць, мужчыны сваіх гадаванцаў расхвальвалі: маўляў, мой сабака ключы ад машыны прыносіць, мой газету падае, мой дзверы адчыняе, а мой... размаўляе!

Вось тут прысутныя не паверылі. Чалавек — у заклад. Прывёў сабаку. А далей... І загадваў яму, і прасам прасіў, той... нават не гаўкнуў!

«Ну што ж ты мяне так падвёў?!» — наракае мужчына па дарозе дамоў. — Дурнем выставіў, на грошы кінуў...» Сабака ў адказ: «Не бядуй, гаспадар! Уяўляй, колькі заўтра падымем!»

Згадзіцеся: разумны сабака — умее выгаду шукаць, а ўжо прадбачыць... Паводле **спадарыні Зоі Наваенкі з Глыбоччыны:**

*Гаспадыню Рэкс раўнуе:*
*Адпусці ў клуб такую, —*
*Стопудова — быць бядзе,*
*Нехта возьме і звядзе.*
*Той жа Янка сёння рана*
*Ужо ля лавачкі*
*з баянам....*

Умее іграць! І каб толькі! На думку **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавіч,**

*Гарманіст вясковы Ясь*
*Развучыў «сабачы вальс»,*
*Ён жа выдумаў фігуры...*
*Добра выйшла —*
*у натуры!*
*Уся вуліца гудзе —*
*Рэпетыцыя ідзе!*

А можа, і зусім не яна: мо, героі падчас здымкі

*Не вяселле сустракалі,*
*Не гасцей з замежжа —*
*Дзетак з горада чакалі*
*Цэлы доўгі снежань.*
*А яны усё не едуць,*
*Бо пытаецца дачка:*
*«Як вы там, бабуля з дзедам,*
*Ці калолі парсючка?»*

Рацыянальны, цвярозы падыход — уласцівы сучаснай моладзі, што заўважана не толькі **спадаром Сабалеўскім з Узды,** але і **спадарыняй Соф'яй Кусянковай з Рагачоўшчыны,** якая піша (пра сябе, не пра сябе — справа дзясятая):

*Палюбіла я Івана —*
*Добра польку танцаваў!*
*Толькі вось адна загана:*
*Кожны вечар выпіваў...*
*А з п'яным якія скокі?*
*Хіба толькі «Пайдзі спаць»...*
*Ну й паслала...*
*Недалёка:*
*Лепей з цюцькам танцаваць!*

Кожны выбірае па сабе — і, дай бог, не п'янку! А то — у адной вёсцы казалі — мужчына ў студню ўваліўся. Пяць сутак шукалі — думалі, загінуў. Аж не: знайшлі, дасталі... Той паверыць не мог, што пяць дзён не піў!.. І пасля гэтага, думаеце, ніні? А як жа: «Ён кінуў піць, бо спіць» — ёсць такі надпіс на помніку.

А вось той, хто спаць не ўлёгся, хто жывы і больш-менш здаровы, — чаго толькі не зробіць! Альбо не вытварыць. Ну вось, напрыклад (паводле той жа **спадарыні Кусянковай**):

*Бравы дзядзька Феакціст —*
*Самы лепшы гарманіст!*
*Калі «Барыню» зайграе, —*
*Нават Жулік падвывае!*
*І жанкі напераброй*
*Запрашаюць на пастой...*
*Кожнай*
*дзядзька адмаўляе:*
*«Жонка, бачыш, не пускае».*

(Адзін такі ж — да слова — з санаторыя вярнуўся, дома расказаў, як яго лячылі-кармілі, а потым жонцы па сакрэце: «І ты без мяне туды не паедзеш, і сябе больш ніколі не пушчу»).

Карацей, яно файна, калі ў чалавека нейкі тормаз ёсць, а то ж, паводле **спадара Аляксандра Матошкі з Расоншчыны,**

*Ноты —*
*птушкамі ў нябёсы*
*Пасыпае гарманіст!*
*Нават цюцька —*
*вось дзівосы —*
*Можа лёгка выдаць твіст...*
*Хоць...*
*З напарніцай такою*
*Грэх і мне б не вальсаваць...*
*Шкода,*
*ў жонкі пад пятою:*
*Цяжка потым*
*«адграбаць».*

Хоць тут, магчыма, і ніякай рэўнасці: бо на здымку (што заўважана **спадарыняй Наваенкай**), муж і жонка, у якіх

*Хоць не тая маладосць, —*
*Цуд,*
*якая прыгажосць!*
*Выступаць сужэнцы рады:*
*Ну яшчэ б — прыйшлі Каляды!*

І ўжо тады:

*Не гадамі маладыя,*
*А пявучаю душой...*
*Калі сэрцайка заные*
*З імі крышачку пастой.*
*І тады сплывуць памалу*
*Крыўда, боль і каламуць,*
*Схлыне чорная навала,*
*Струны сэрца ажывуць!*

З таго самага канверта, ад **спадарыні Чыгрынавай,** і кароткі заклік:

*Грай, музыка мой, іграй,*
*Прагаяні самоту!*
*Ўспамінай,*
*мой любы край,*
*Як жылі ў ахвоту:*
*Як масцілі мы дарогі,*
*Не баяліся пагроз,*
*Працавалі да знямогі*
*І смяяліся да слёз.*

Зрэшты, пра гэта, як лічыць **спадар Сабалеўскі,** варта не толькі ўспамінаць:

*Меней клубаў і людзей,*
*Чым было калісьці?*
*Многа страчаных надзей?*
*Але ж знойдзем выйсце!*
*Жытка часта — не мядок,*
*Ды гармонік грае!*
*Гэта вёска Новы год*
*Зноўку сустракае!*

І, дасць бог, будзе сустракаць! Можа, нават з гармонікам і з прыпеўкамі. Ну вось як вам (ад **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў**)

*Гэта, дзеўкі, не падман,*
*Гэта ўжо традыцыя*
*Расцягнуў баян Раман —*
*Будзе рэпетыцыя.*

***

*Танцавала я з Валерам, —*
*Ногі потым — не пазнаць.*
*Чым такія кавалеры,*
*З цюцькам буду танцаваць!*

***

*Нам прышчэпкі ад «кавід»*
*Раіць медыцына.*
*Але й танцы пад баян —*
*Файная вакцына!*

***

*Каля хаты новы плот,*
*Каля плота — лавачка...*
*Як зайграе Ясь факстрот,*
*Мігам выйдзе Клавачка!*

***

*Запрашаем мы суседзяў*
*На Каляды ў хату,*
*Хто не хоча піць гарэлку,*
*Будзе піць гарбату!*

Не адстала па колькасці прыпевак і **спадарыня Гудачкова:**

*Рады, рады, што Каляды*
*І сняжку падсыпала.*
*Мы зайграем-заспяваем*
*І станцуем «лысага».*

***

*Каля дома цётка Стася*
*З Рэксам танчыць узялася...*
*Значыць, з вёскі не цяпер*
*Збег апошні кавалер.*

***

*Не глядзіце вы праз вокны,*
*Не сядзіце ў хатах!*
*Разам добра пагуляем*
*На зімовых святах!*

І, нарэшце (з даўняга, з народнага, але ж тут сапраўды дарэчы!):

*Ігрэй, іграчу,*
*Я табе заплачу.*
*Як сучку прадам,*
*Тады грошы аддам...*

Так, ва ўсялякі выпадак: абяцанка цацанка, а дурню...

Працяг тэмы ў **спадара Сабалеўскага**:

***

*На Каляды — першы снег,*
*Што сабаку ў свята.*
*Усім здароўя цэлы мех*
*І ў дом — дастатак!*

***

*Музыкант харошы з Колі*
*Граць пачне — сапраўдны ас...*
*Нават Шарык з цёткай Поляй*
*Выдае «сабачы вальс».*

Гэта — ад **спадарыні Наталлі Шкут са Светлагоршчыны.**

*Эх, гады мае гады!*
*Так здаўна вядзецца,*
*Як пабачыш маладых, —*
*Маладосць прачнецца!*

***

*Грай, гармонічак, іграй —*
*Лепей не спыняцца!*
*Ў новым годзе будзем жыць,*
*Ліху не здавацца!*

Вось на гэтых аптымістычных нотах (ад **спадарынь Зоі Наваенкі і Таццяны Новік з Клецка**) можна было б паставіць кропку, але ж, па традыцыі, трэба падвесці вынікі папяровых «баталій». Такім чынам, на здымку (гл. нумар «Звязды» за 9.12. 2020) быў мужчына з нагружанай тачкай, следам за якім ішла група юных таварышаў.

Дык вось, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра гэты «калектыў» склалі **спадарыні Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Зоя Максімава з Віцебска, Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, Любоў Чыгрынава з Мінска, спадары Віктар Сабалеўскі з Узды, Мікалай Старых з Гомеля, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Іван Астроўскі з Мінска.**

Іншымі словамі, малайцы ўсе! Маленькаму рэдакцыйнаму журы зноў давялося паспрачацца і... Прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» на другі квартал 2021 года застаецца ў сталіцы, у **сужэнцаў Астроўскіх.**

Вы таксама хацелі б пяць разоў на тыдзень атрымліваць «родную газету на роднай мове»? Тады варыянтаў два: альбо своечасова афармляць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на новы конкурсны здымак і прыдумаць да яго найлепшы подпіс — не больш чым з васьмі радкоў.

Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



**Ад іх жа** шчырыя прабачэнні ўсім, чые творы не прайшлі строгага конкурснага адбору — на гэты раз. Затое ў наступны...

Шанцы ёсць у кожнага. Пішыце! І помніце: «Пакуль мы смяёмся — з намі ўсё ў парадку», бо «Смех — гэта сонца: яно праганяе зіму з чалавечага твару».

Да сустрэчы вясной!

Харужанцы.



# «ГУЛЯЙ, ЗІМА, ТВАЯ ЧАСІНА!»

У наступным годзе краіна будзе адзначаць сто сорак гадоў з нараджэння нашых славутых Янкі Купалы і Якуба Коласа. Напярэдадні іх юбілеяў «Звязда» на сваіх старонках час ад часу будзе паказваць фатаграфіі тых мясцін, дзе прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады паэтаў, дзе ўзрасталі і выспявалі іх талент. І ў першую чаргу наша ўвага будзе звернута на музейныя комплексы і тэрыторыі-запаведнікі, такія як Вязынка і Акінчыцы, Харужанцы і Альбуць, Якімоўшчына і Смольня і іншыя паэтавы мясціны. А яны — родныя куточкі Купалы і Коласа — заўсёды выклікалі і выклікаюць жывы інтарэс, бо не толькі з імі знітаваныя паэтычнай спадчынай, але і знаходзяцца на ўлонні матухны-прыроды, з яе непаўторнымі ландшафтамі, якія атулялі і песцілі народных геніяў, але, як і належыць сапраўдным «мясцінам сілы», рабілі іх мацнейшымі духам і целам. Якое гэта шчасце — бачыць суладдзе надвор'я і стану прыроды, натхняючыся ім, шукаць паэтычныя рыфмы і эпітэты! Першыя беларускія класікі былі захопленыя стыхіяй і не ўяўлялі сваю творчасць без апісання прыгажосці навакольнага свету ў розныя сезоны. Вось як пісаў Янка Купала пра зіму:

*«Скрыпяць санкі на марозе*
*Па выслізганай дарозе...*
*Эй, каб шчаснай больш часінкі,*
*Вось бы злётаў да дзяўчынкі...»*

З гэтымі радкамі пераклікаюцца «зімовыя» страфы Коласа:

*«Ёсць хараство і ў гэтых зімах*
*І ў мёртва-белых тых кілімах,*
*Што віснуць-зззяюць хрусталямі*
*Над занямелымі лясамі...»*

Сёлетняя зіма — проста цуд, яна не дае спакою, кліча ў блізкія-далёкія, аснежана-снежныя далягляды. Ізноў мне даводзіцца зачароўвацца гэтымі абшарамі і простай вясковай архітэктурай, якая на бялюткім покрыве ператвараецца ў сапраўдную мастацкую графіку. Асабліва гэта відаць на здымках з вышыні.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

На гэтых здымках паказаны Купалавы Акопы, Харужанцы і Вязынка, Коласавы Акінчыцы, Смольня і Альбуць.

**Фота аўтара.**



Вязынка.



Альбуць.



Акінчыцы.



Акопы.



Смольня.

# ПЕРЕЖИРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Пуховичского района Минской области

**05 марта 2021 года в 14.30 в здании Пережирского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: д. Пережир, ул. Гуриновича, 2«а» Пуховичского района Минской области, проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № лот | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, аг. Зазерка, ул. Народная, 5А, 624484804601000786 | 0,1333 | Электроснабжение, газоснабжение, ЖД-сообщение, максимальное сохранение сосны кедровой | 1311,75 + объявление | 6382,40 | 638,24 |
| 2 | ПОВТОРНО Минская область, Пуховичский р-н, д. Узляны, ул. Центральная, 2Б, 624484809301000335 | 0,1280 | Электроснабжение, газоснабжение, озеро | 1457,15 + объявление | 4305,60 | 430,56 |
| 3 | ПОВТОРНО Минская область, Пуховичский р-н, д. Узляны, ул. Центральная, 2В, 624484809301000336 | 0,1329 | Электроснабжение, газоснабжение, озеро | 1544,38 + объявление | 4470,42 | 447,04 |

Задаток для участия в открытом аукционе перечисляется на счет р/с **BY20AKBB36006251300090000000,** г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», код **AKBBBY2X,** УНП 600537220 (казначейство), ОКПО 04429668, код платежа 04901, **получатель – Пережирский сельский исполнительный комитет.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 17.00 **26 февраля 2021 года** по вышеуказанному адресу.

Осмотр земельного участка на местности проводится (вторник, четверг с 14.00 до 17.00).

Открытый аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.02.2008 г. № 462.

Расходы по организации и проведении аукциона, расходы на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально в случае, если интересы покупателя представляет это лицо.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Контактные телефоны: (801713) 46-3-96, 46-188, 46-006.

Информация об аукционе размещена на сайте Пуховичского райисполкома.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 9 марта 2021 года АУКЦИОНА по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества открытого акционерного общества «Общепит «Школьник»

| 1. № лота – наименование объекта и его место нахождение | Лот № 1 - часть капитального строения с инвентарным номером 110/С-90328, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69В | Лот № 2 - капитальное строение с инвентарным номером 110/С-90337, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69Л (кондитерский цех); - изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2753475, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69Д-4а | Лот № 3 - капитальное строение с инвентарным номером 110/С-90340, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69Ж |
|---|---|---|---|
| 2. Арендуемая площадь, м$^2$ | 359,73 (303,73 м$^2$ помещение + 56 м$^2$ рампа) | 154,9 (139 + 15,9) | 214,0 |
| 3. Характеристика объекта | Имеется электроснабжение, развитая транспортная инфраструктура | Имеется электроснабжение, водоснабжение, канализация, отопление, развитая транспортная инфраструктура | Имеется электроснабжение, развитая транспортная инфраструктура |
| 4. Начальная цена продажи права заключения договора аренды, базовых арендных величин | 89,9325 | 38,725 | 53,5 |
| 5. Сумма задатка, базовых арендных величин | 8,993 | 3,873 | 5,35 |
